Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 5 1932 г. № 174 (4426).

Год выданьня XV

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫЯ: Плян завозу тавараў у вёску выканаць сваячасова і поўнасьцю. Юбілей «Зьвязды» адзначыць бальшавіцкім выкананьнем чарговых дырэктыў партыі.

АБ УСЕСАЮЗНЫМ РЭЙДЗЕ ЎДАРНІКАЎ ДРУКУ ПА БАРАЦЬБЕ СА СТРАТАМІ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ—Пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).

Аб выніках правядзеньня ў БССР усесаюзнага конкурсу нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, абвешчанага газэтай «Правда»—Пастанова цэнтральнай камісіі пры «Зьвязьдзе» па кіраўніцтву конкурсам (2 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ. — Ліст і «скрынка»... (3 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

Міжнародны чырвоны дзень за мяжой (4 стар.).

Расстрэл бастуючых рабочых у Горадні (4 стар.).

Што далей? (4 стар.).

Плян завозу тавараў у вёску выканаць сваячасова і поўнасьцю

Партыя і ўрад у апошні час прынялі рад важных пастаноў, ажыцьцяўленьне якіх павінна забясьпечыць выкананьне прамысловасьцю БССР праграмы выпуску тавараў шырэйшаму звыш пляну на дзесяткі мільёнаў рублёў.

Гэтыя пастановы абавязваюць гаспадарчыя і каапэрацыйна-гандлёвыя арганізацыі кінуць асноўную масу вялізарных таварных фондаў у вёску, насустрач калгаснаму гандлю, прасунуць іх непасрэдна да вытворцы с.-г. прадукцыі — калгасьніка і працоўнага аднаасобніка.

Насычанасьць вёскі таварамі шырокага спажываньня на аснове разгорнутага савецкага гандлю—магутны вагар у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, выкананьні дзяржаўных плянаў загатовак і ўзмацненьні прытоку с.-г. прадуктаў у гарады.

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй выразнасьцю падкрэсьліў надзвычай вялікае значэньне разгортваньня тавараазвароту паміж горадам і вёскай. Але ў той-жа час пленум прымушан быў канстатаваць становішча сустрэчнага гандлю вельмі нездавальняючым. Гэта тлумачыцца «выключна слабай работай спажывецкай каапэрацыі—ад Белкаапсаюзу да сельспажыўтаварыстваў, аслабленьнем гандлёвай дзейнасьці большай часткі спажывецкіх таварыстваў і райспажыўтаварыстваў, няўменьнем іх арганізаваць мясцовы тавараазварот па гандлі прадметамі сельскага спажываньня мясцовай выпрацоўкі, невыстарчальнай работай гандлёвых аб'яднаньняў БКС па завозу тавараў у вёску».

Пасьля пленуму прайшоў месяц. Ці дабілася тавараправодзячая сетка рашучага пералому ў сваёй рабоце?

Ліпеньскі плян завозу тавараў шырспажыву ў вёску выканан аб'яднаньнямі БКС на 91,8 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што рад арганізацый апартуністычна аднесьліся да ажыцьцяўленьня важнейшай дырэктывы. Характэрна, што **таварныя астачы на 1 ліпеня перавышаюць ліміты на 2,2 млн. руб. Мэтады мэханічнага разьмеркаваньня, самацёк у рабоце — асноўныя прычыны затаварваньня.**

ЦК КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове ад 23 ліпеня зрабіў адпаведныя аргывады ў адносінах да тых работнікаў і арганізацый, якія парушаюць дырэктывы партыі аб першачарговасьці адгрузкі тавараў у вёску. Дырэктар Белгандлю тав. **Шаевіч** ад работы адхілен. Раду работнікаў абвешчаны вымовы.

Аналёгічная пастанова вынесена ЦКК УсеКП(б) у адносінах некаторых кіруючых работнікаў Белшвэйаб'яднаньня, Саюзшвейзбыту, Белкаапсаюзу і інш. каапэрацыйных і гандлёвых арганізацый.

Гэтыя ранэньні павінны паслужыць папярэджаньнем для ўсіх партыйных і гандлёва-каапэрацыйных арганізацый.

Асноўныя патрабаваньні, якія прад'яўляюцца да спажывецкай каапэрацыі і дзяржгандлю, заключаюцца ў тым, **каб патоки тавараў у вёску — да калгасьніка і працоўнага аднаасобніка.** Мала выпісаць нарад на адгрузку тавараў. Гэтага яшчэ недаволі. Трэба дабіцца самага галоўнага, на што паказваў у сваім лісьце тав. **Постышаў,—прасачыць за тым, каб тавары не асядалі ў гарадох і раённых цэнтрах, не замарожваліся, не растранжыраваліся.**

Неабходна забясьпечыць максымальнае паскарэньне прасоўваньня тавараў да спажыўца, правільна арганізаваць продаж іх. Гэта мае **выключнае значэньне для выкананьня фінансавага пляну.**

Гэта можа быць дасягнута шляхам паляпшэньня работы міжраённых баз, ліквідацыі абязьлічкі ў завозе тавараў, прадастаўленьня нізавым каапэрацыйным зьвеньням і ў першую чаргу сельспажыўтаварыствам магчымасьці адбіраць тавар у тым асартымэнце, якога патрабуе спажывец.

Патрэбна рашучая барацьба з мэханічнай засылкай тавараў на вёску, з прымусовым асартымэнтам, ростам таварных астач, з усімі скажэньнямі партыйнай лініі ў савецкім гандлі. Між тым, іменна ў гэтай галіне шмат недахопаў і грубейшых скрыўленьняў.

Намі ўжо прыводзіліся неаднаразовыя факты замарожваньня тавараазвароту, злачынната іх затрыманьня на складах. Цяпер яшчэ на базах раду каапэрацыйна-гандлёвых і прамысловых аб'яднаньняў ляжаць мёртвым капіталам тавары шырспажыву на сотні тысяч рублёў. На базе прамсаюзу ў Гомелі ляжыць бяз руху многа матыг, грабляў, так патрэбных для прапалочнай і ўборачнай кампаніі, ляжыць 100 кажухоў, 21 бачонак дрыўляных цьвікоў, 2 тоны дроту. З-за бюракратычнай упартасьці базы Белкаапсаюзу на працягу 4-х месяцаў ня выкуплялася 1.150 скрынак мыла-пасты і 2 вагоны вадкага мыла.

Наглядаюцца нават факты супраціўленьня завозу прамтавараў. Характэрны выпадак у Давідаўскім сельспажыўтаварыстве. Старшыня яго—Абрамаў проста адмовіўся забраць з базы райспажыўсаюзу галёшы і ня раз адсылаў назад вострa-дэфіцытныя тавары. «У мяне ўсе апрануты, ніхто ня хоча купляць» — з яўным «оппортуністычным» адказаў Абрамаў. Да якіх кур'ёзаў даходзіць справа, паказвае такі факт. У Прыбыткаўскім сельсавеце забылі прывезьці... соль і сяляне за некалькі кілёмэтраў хадзілі ў попуках солі.

Вельмі адмоўна адбіваецца на тэмпах рэалізацыі прамтавараў спозьненая прысылка рахункаў, фактур, без чаго затрымліваецца продаж тавараў. Такія зьявішчы назіраюцца ва многіх раёнах. На базе Гомельскага райсаюзу 11 дзён праляжала без рахункаў партыя бялізны з Саюзшвейзбыту.

Такое нездавальняючае становішча выкананьня дырэктыў аб савецкім гандлі выцякае «з недаацэнкі рэдам партыйных, савецкіх, гаспадарчых і каапэрацыйных арганізацый усёй палітычнай і эканамічнай важнасьці мерапрыемстваў партыі, выключнай пенаваротлівасьці гэтых арганізацый і бюракратычных адносін з боку раду работнікаў да гэтых важнейшых дырэктыў партыі».

Посьпех тавараснабжэньня вёскі ў значнай ступені вырашае сельспажыўтаварыства, якое зьяўляецца асноўным зьвяном савецкага гандлю на вёсцы. Работа большасьці сельспажыўтаварыстваў на сёнешні дзень ня можа задаволіць. Калі ўлічыць, што ўсе плянавыя тавары, якія накіроўваюцца ў вёску, павінны рэалізоўвацца праз сельспажыўтаварыствы, дык стане зразумелым, якое выключна важнае значэньне на даным этапе набывае работа нізавой вясковай сеткі каапэрацыі.

Неаткладна дабіцца рашучага ўзмацненьня нізавога сельскага каапэрацыйнага зьвяна—спажыўтаварыства, ачысьці яго ад клясава-варожых элемэнтаў, наладжаньня грамадзкага кантролю,—галавая задача ўсіх партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

Неабходна, каб сельспажыўтаварыствы павярнуліся як сьлед тварам да таварных патокаў, якія ідуць з гораду, да вясковага спажыўца, каб нізавыя зьвеньні каапэрацыі ператварыліся ў сапраўдных арганізатараў савецкага гандлю і ўсямерна дапамагалі выхаду с.-г. прадукцыі на савецкія рынкі.

Усебеларускі дэкадзнік праверкі прасоўваньня тавараў у вёску, — важнейшае практычнае мерапрыемства па цягненьні мас у праверку выкананьня дырэктыў партыі аб максымальным паскарэньні тавараазвароту паміж горадам і вёскай. Задача дэкадніка—выявіць ход прасоўваньня тавараў па ўсіх лініях—ад фабрыкі да сельспажыўтаварыства, выкрыць канкрэтных вінаватых замарожваньня і бюракратызацыі тавараазвароту і дапамагчы выправіць усе недахопы і памылкі.

Абавязак друку, усіх арганізацый мабілізаваць рабочыя і калгасныя масы на барацьбу за сваячасовае і поўнае давядзеньне таварных фондаў, якія ідуць насустрач калгаснаму гандлю, да вясковага спажыўца, за зьнішчэньне ўсіх бюракратычных рагатак на шляху прасоўваньня тавараў.

Бязьлітасна змагаючыся з правымі апартуністамі, з «левакамі», з усякімі скажэньнямі лініі партыі ў разгортваньні савецкага гандлю, выкараняючы рэшткі «пэпманскага духу», гандлярства, — трэба дабіцца карэннага паляпшэньня ў рабоце тавараправодзячай сеткі зьверху да нізу.

Выразнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб савецкім і калгасным гандлі і прасоўваньне тавараў у вёску павінна стаць асноўным стрыжнем работы ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый.

«Нам трэба дабіцца таго, каб кожны член партыі, кожны працоўны ўявіў сабе, што пытаньне разгортваньня савецкага гандлю зьяўляецца адным з рашаючых пытаньняў на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва» (Шаранговіч).

УБРАЦЬ ЛЁН У РАНЬНЯЙ ЖОУТАЙ СЬПЕЛАСЬЦІ

МАСАВАЕ ЦЕРАБЛЕНЬНЕ, АЧОС І АБМАЛОТ—СУСТРЭЦЬ ВА УСЕЎЗБРАЕНЬНІ

Не дамо перастойваць ільну

У гэтым годзе МТС БССР павінны ўбраць 63.369 га ільну.

Для пасьпяховага правядзеньня гэтай адказьнейшай задачы кіраўніцтва Трактарацэнтру і кожнай МТС павінна зараз-жа, адначасова з узмацненьнем тэмпаў уборкі азімых і яравых мабілізаваць максымум сваіх сіл на поўную падрыхтоўку і ўборку тэхнічных культур.

У гэтым годзе ўборка тэхнічных культур павінна прайсьці ў максымальна кароткія тэрміны. Для гэтага ёсьць усе ўмовы. Значна палепшылася забясьпечанасьць МТС і калгасаў уборачнымі машынамі.

Ільнаводчыя раёны ільнацерабілкамі забясьпечаны на 65 проц. (1.000 штук).

Поўнасьцю забясьпечаны МТС машынамі Гільштэйна па абрыўцы галовак і малатарнямі «Эдзі». Апрача тых, якія знаходзяцца ў калгасах, у МТС ёсьць 546 шт. малатарань «Эдзі», або 100 проц. патрэбнасьці. У мінулым годзе гэтых малатарань было ўсяго 300 шт. Амаль поўнасьцю забясьпечаны МТС і ільнамялкамі. Адных 6-цілтарвальных мялак ёсьць 200 шт. Распачата пабудова трапальных калёс, якія ўяўляюць з сябе рэканструяваную машыну «Эдзі». 10 жніўня будзе праведзена выпрабаваньне іх якасьці. Апрача гэтага, у гэтым годзе ў БССР у тэхніку апрацоўкі ільну ўводзіцца новая машына ільна-мялка-трасілка, якая прызначана для апрацоўкі кароткага ільну. Карысна гэта мялка тым, што яна будзе апрацоўваць высушаную ільнасалому, без папярэдняй апрацоўкі і замест пакульля атрымліваецца ільняны луб. З гэтага лубу вырабляюць катаніи (вату), які ў мешаніне з бавоўнай ідзе на выраб тканіны. Такіх мялак-трасілак у гэтым годзе будзе завезена 18 шт.

З прыведзеных фактаў відаць, што ўсе ўмовы для пасьпяховага правядзеньня ўборкі і апрацоўкі ільну ёсьць. Посьпех справы будзе залежыць ад таго, наколькі кіраўніцтва Трактарацэнтру і МТС здолеюць поўнасьцю і ў тэрмін выкарыстаць усе магчымасьці, правільна расставіць сілы ў калгасах і забясьпечыць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам уборкі.

На жаль, трэба канстатаваць, што становішча з падрыхтоўкай і ўборкай ільну па Трактарацэнтру нездавальняючае. Трактарацэнтр на сёнешні дзень нічога ня ведае аб тым, як рыхтуецца МТС да ўборкі і апрацоўкі ільну. Ня ведае, колькі падрыхтавана сушылак, мачыльных ям і пунктаў па першапачатковай апрацоўцы ільну. Падрыхтоўкай ільнаапрацоўчых машын у калгасах ніхто не займаецца. Трактарацэнтр, для таго, каб даведацца аб сапраўдным стане повішчы падрыхтоўкі да ўборкі і апрацоўкі ільну, толькі 8 жніўня думае склікаць сваіх інспэктароў і прадстаўнікоў МТС. Загадчык вытворчага сэктару Трактарацэнтру т. Тарасаў лічыць, што ўборка ільну распачнецца толькі 10 жніўня.

Між тым, па БССР лён раньняга пасеву на плошчы каля 50 тыс. га можна і трэба ўбіраць з 1 жніўня.

Зводка Трактарацэнтру на 1 жніўня сьведчыць аб тым, што ўборка ідзе зусім марудна. З 63.369 га ўбрана толькі 241 га, ці 0,3 проц. З 22 ільнаводчых МТС распачалі ўборку толькі 4. Рад МТС, як Сіроцінская, Рэчыцкая і інш. убралі толькі 0,1 проц. плошчы. Большасьць дырэктараў МТС уборку ільну прадставілі самацёку. МТС убоку ільну прадставілі самацёку.

Уборка ільну, як і іншых культур, павінна ў гэтым годзе праводзіцца пад лёзунгам барацьбы са стратамі. Гэта абавязвае ільнаводчыя МТС ва ўсеўзбраеньні сустрэць масавае церабленьне, ачос і абмалот.

Камсамол БССР уключыўся ў спаборніцтва на лепшае правядзеньне ўборкі

Камсамол БССР уключыўся ва ўсесаюзнае спаборніцтва камсамольскіх вясковых арганізацый, на лепшае правядзеньне ўборкі ўраджаю і загатовак, абвешчанае ЦК УсеЛКСМ.

Цэнтральнай задачай спаборніцтва зьяўляецца барацьба са стратамі пры ўборцы, максымальнае скарачэньне тэрмінаў уборкі, правільны ўлік прадукцыі і сабранай прадукцыі, правільнае разьмеркаваньне яе сярод калгасьнікаў і сваячасовае выкананьне пляну загатовак.

Для дапамогі райкомам камсамолу і парт'ячэйкам выяжджае ў раёны 50 чал. цэнтральнага актыву да канца ўборкі. Гаркомам і райкомам камсамолу найбольш буйных пралетарскіх цэнтраў, як Віцебск, Менск, Гомель, Магілёў, Бабруйск, Ворша, Барысаў і Полацак прапанавана накіраваць для дапамогі суседнім раёнам 250 лепшых камсамольцаў-актывістаў.

Для прэміяваньня за лепшае правядзеньне ўборачнай і загатоўчай кампаніі вылучан прэміяльны фонд у колькасьці 30 тыс. руб.

Перадавікі ўборачнай

КЛІЧАЎ. Калгасы **«Барацьбіт», імя Мслатава і імя Лекерта** па 30 ліпеня скончылі ўборку азімых.

Калгас «Барацьбіт», убраўшы 80 га жыта і 15 га ячменю, пераключыўся на дапамогу суседнім калгасам і саўгасу Александрава. **А.**

* * *

КАПЫЛЬ. Калгас **«Ленінец»** 28 ліпеня скончыў уборку азімых на плошчы ў 65 га. Скончыўшы ўборку, калгас у парадку міжкалгаснай дапамогі машыны і рабочую сілу накіраваў у адстаючыя калгасы. **Б.**

КРЫЎДА КАЛГАСЬНІЦЫ КАЛДУНОВАЙ

ЛЕЗНА. (Наш кар.). Лён ужо знаходзіцца ў стадыі жоўтай сьпеласьці. Пачалася ўборка.

На 30 ліпеня паводле даных райза па раёне ўбрана 152 га — каля 1 проц. засеянай плошчы. Усяго-ж патрэбна ўбраць **14.462 га ільну.**

Улічыць першыя ўрокі ўборкі ільну, скарыстаць дадатны вопыт, перанесьці яго ва ўсе калгасы, выправіць памылкі па-ходу—такава задача партыйных ячэек, сельсаветаў і раённых арганізацый.

Аб чым гаворыць практыка ўборкі ільну і першыя дні перабленьня?

Асноўны недахоп — ня зусім правільна арганізаваны і расстаўлены сілы.

Калгас **«Бальшавік»**, Чарнічскага сельсавету, пачаў церабленьне 30 ліпеня. За поўдня выцераблена 2,5 га. Усяго трэба выцерабіць 82 га. Тэмпы слабыя. Яшчэ не раскачаліся. Што перашкаджае?

Па-першае, не праведзена масава-растлумачальная работа сярод калгасьніц; падругое, вызначаныя нормы надзвычай малыя — 16 чал. па адзін га. У дадатак норма ўраўніцельная — ці густы, ці рэдкі лён, ці пясчаная, ці гліністая глеба — роўная норма — 16 чал. Гэта няправільна.

З першага дня пашлі параканьні:

— У вас лён рэдзенькі, вы не церабілі яго, а прабеглі.

— Чаму ім залічылі аднолькавую колькасьць працадзён тады, калі яны парвалі менш ільну, чым мы, хаця і большую плошчу апрацавалі,—крыўдзіцца брыгада № 2 на брыгаду № 1.

Крыўда правільная. Напрыклад, калгасьніца **Калдунова** Фядосьля працавала асобна па густым і засьмечаным ільне, старалася, наставіла шмат снапоў, а ёй залічылі толькі плошчу. Зусім ня ўлічваецца якасьць, інтэнсіўнасьць работы. Фядосьля яўна незадаволена.

На запытаньне, ці ня лепш было-б ужесьці пакопную зьдзельшчыну, улік працы ў залежнасьці ад колькасьці выцераблена ільну не па плошчы, а па снапох — старшыня калгасу тав. **Ліцьсянкоў** адказвае:

— Гэта найлепшы выхад, так і зробім. Сёньня-ж абгаворым з калгасьнікамі.

Такі вопыт быў і летась. Ён даў станоўчыя вынікі. Чаму-ж не скарыстоўваецца лепшы вопыт леташняй уборачнай кампаніі? Відавочна, МТС мала гэтым цікавіцца, бо калгас «Бальшавік» абслугоўваецца МТС. Задача МТС—дабіцца, каб ва ўсіх калгасах была ўведзена пакопная зьдзельшчына, выходзячы з норм Калгасцэнтру.

МТС павінна дабіцца, каб разьбежка ў нормах была ліквідавана. Бо чаго варты такі прыклад, калі калгас «Бальшавік» вызначыў норму ў 16 чал. па га, а калгас **«Іскра»** — 9 чал. Глебы-ж аднолькавыя, таксама як і ільны.

Як правіла, амаль ва ўсіх калгасах церабленьне ільну пачата дробнымі вытворчымі групамі, якія часта па сваім жаданьні разьбіваюцца на зьвеньні. Гэта добра. Трэба толькі ўзмацніць партыйна-масавую работу і разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж групамі, зьвеньнямі і калгасамі.

Добры прыклад паказаў адзін з рашаючых ільнаводчых сельсаветаў — **Кальшанскі.** Там удасканалена малатарня «Эдзі». Зь мест 2-х валоў зроблена 3. У выніку прадукцыйнасьць павялічылася ў 2 разы. Такімі машынамі забясьпечаны ўсе калгасы Кальшанскага сельсавету. Яны зроблены яшчэ зімой.

«Зьвязда» ў лютым пісала пра гэтыя рацыяналізатарскія прапановы калгасьнікаў. Наркамзем БССР праверыў прапанову па месцы, узяў мадэль, выклікаў у Менск вынаходцу, пасылаў яго ў розныя цэнтры і... замоўк. Удасканаленая ільнамалатарня, простая па сваёй канструкцыі ня выйшла з межаў Кальшанскага сельсавету.

Няма ў раёне сур'ёзных клопатаў аб прыстасаваньні мялыла-сушыльных пунктаў. Тут лічаць, што час для іх арганізацыі яшчэ не паступіў. Нездавальняюча ідзе будаўніцтва 3 ільназаводаў.

Церабленьне ільну, падрыхтоўка да перапрацоўкі яго патрабуе большай увагі парт'ячэек і сельсаветаў і раённых арганізацый Лёзьнянчыны. **А. М.**

Юбілей „ЗЬВЯЗДЫ" адзначыць бальшавіцкім выкананьнем чарговых задач партыі

Пятнаццацігадовы шлях «Зьвязды»—гэта шлях барацьбы і перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, шлях нястомнай барацьбы за генэральную лінію партыі, барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай унутры партыі—апартуністамі розных колераў.

«Зьвязда» была і ёсьць вастрэйшай зброяй у руках камуністычнай партыі, была і ёсьць калектыўным прапагандыстам, агітатарам і арганізатарам працоўных мас БССР на выкананьне пастаноў партыі.

Сіла пралетарскага друку ў тым, што ён зьяўляецца масавым друкам, што ён арганізоўвае мільённыя масы працоўных вакол партыйных задач, мабілізоўвае шырокія пласты працоўных на барацьбу за перамогу сацыялізму. Сіла нашага друку ў тым, што ён, пад кіраўніцтвам партыі, арганізаваў, загартаваў і выхаваў магутную армію рабселькораў—«каманд'ніраў пралетарскай грамадзкай думкі» (Сталін), актыўных барацьбітоў за сацыялізм. «Зьвязда» ўвесь час свайго існаваньня была і зараз зьвязана з сямымі шырокімі працоўнымі масамі. Сотні і тысячы рабочых, калгасьнікаў і працоўных сялян прымалі і прымаюць актыўны ўдзел у яе рабоце.

Таму пятнаццацігадовы юбілей «Зьвязды» і 5-цігодзьдзе пераводу яе на беларускую мову мае для ўсёй партыі, для ўсіх працоўных вялікае палітычнае значэньне, і задача кожнай партыйнай арганізацыі раёну, гораду, сельсавету, кожнага прадпрыемства, саўгасу, МТС, калгасу адзначыць падрыхтоўку і правядзеньне юбілею органу ЦК КП(б)Б «Зьвязды» канкрэтнымі справамі.

У надрукаванай у «Зьвязьдзе» пастанове ЦК КП(б)Б «аб пятнаццацігодзьдзі «Зьвязды» і пяцігодзьдзі пераходу яе на беларускую мову» адзначана, што «галоўная ўвага партыйных, грамадзкіх арганізацый і ўсяго друку пры правядзеньні юбілею павінна быць сканцэнтравана на павышэньні тэмпаў і якасьці работы па выкананьні задач, якія стаяць перад КП(б)Б у справе выкананьня праграмы 4-га заключнага году пяцігодкі, і па разгортваньні шырокай падрыхтоўчай работы да выкананьня сусьветна-гістарычнага значэньня задач, пастаўленых партыяй у другой пяцігодцы. Юбілей павінен прайсьці пад знакам няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, разгортваньня барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай унутры партыі—правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад лініі партыі».

Кожная партыйная арганізацыя, кожная парт'ячэйка павінны ў часе правядзеньня юбілею дабіцца шырокага разгортваньня на прадпрыемствах з боку рабочых самаабвязацельстваў па выкананьні прамфінпляну на падставе няўхільнага ажыцьцяўленьня 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, гэта ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы, якасьці работы, вырабу і прасоўваньні тавараў шырокага спажываньня.

Задача кожнай партыйнай ячэйкі--яшчэ больш разгарнуць работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, па-бальшавіцку падрыхтаваць і правесьці загатоўкі, шырока разгарнуць калгасны гандаль, прыняць усе неабходныя меры па далейшым паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых і калгасьнікаў.

Кожнае прадпрыемства, кожны цэх і вытворчая брыгада павінны юбілей «Зьвязды» адзначыць выкананьнем свайго прамфінпляну, большым выпускам тавараў шырокага спажываньня, арганізацыяй новых ударных гаспадарча-разрахунковых брыгад, узьняцьцем якасьці выпусканай прадукцыі.

Кожная МТС, кожны саўгас, калгас, кожны раён павінны паказаць узоры бальшавіцкай барацьбы за сваячасовае і пасьпяховае правядзеньне ўборкі ўраджаю з найменшымі стратамі, арганізаваць чырвоныя абозы па здачы збожжа дзяржаве, сваячасова падрыхтаваць і па-бальшавіцку правесьці чарговую кампанію загатовак, сваячасова правесьці зяблева і асенняю сяўбу.

Бальшавіцкай барацьбой за выкананьне пастановаў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, павышэньнем тэмпаў нацыянальна-культурнага будаўніцтва, узмацненьнем барацьбы за ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі, барацьбы з шавінізмамі розных колераў, узьняцьцем на яшчэ большую вышыню марксыцка-ленінскага выхаваньня і перабудовай арганізацыйнай і масава-палітычнай работы на аснове апошніх дырэктыў партыі--вось чым канкрэтна павінны партыйныя і грамадзкія арганізацыі адзначыць 15-цігодзьдзе органу ЦК КП(б)Б.

Рад гарадзкіх, раённых і нізавых арганізацый, раённы і нізавы друк уключыліся ва ўсебеларускі рэйд імя юбілею «Зьвязды». Неабходна, каб гэты рэйд узьняў на яшчэ большую ступень барацьбу за выкананьне чарговых задач партыі, прыцягнуў шырокія працоўныя масы на ажыцьцяўленьне гэтых дырэктыў, узьняў на вышэйшую ступень сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, значна павялічыў якасьць работы ўдарных гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Задача кожнай партыйнай арганізацыі—разгарнуць шырокую масавую работу вакол юбілею «Зьвязды», папулярызаваць пройдзены ёю шлях у барацьбе за генэральную лінію партыі, шырока ўскрыць недахопы яе работы.

Падрыхтоўка і правядзеньне юбілею «Зьвязды» павінны яшчэ больш узмацніць работу, узьняць ролю і значэньне ўсяго бальшавіцкага друку БССР і асабліва нізавога саўгаснага і калгаснага друку, як калектыўнага прапагандыста, агітатара і арганізатара, вастрэйшай зброі ў руках партыйнай арганізацыі ў барацьбе за генэральную лінію партыі. Падрыхтоўка і правядзеньне юбілею павінны яшчэ больш павялічыць рады актыўных удзельнікаў бальшавіцкага друку, рады рабселькораў.

Працоўныя масы БССР адзначаць 15-цігадовы юбілей «Зьвязды» яшчэ большым згуртаваньнем вакол камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, на чале з правадыром партыі і рабочай клясы тав. Сталіным, згуртаваньнем сваіх радоў вакол ЦК КП(б)Б, узмацненьнем барацьбы за выкананьне плянаў заключнага году першай пяцігодкі і разгортваньнем шырокай падрыхтоўкі да ажыцьцяўленьня плянаў другой пяцігодкі, плянаў пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, яшчэ большым узмацненьнем абароназдольнасьці краіны дыктатуры пралетарыяту.

Юбілей «Зьвязды»--справа ўсёй партыйнай арганізацыі і пралетарскай грамадзкасьці, справа ўсяго друку БССР.

Аб усесаюзным рэйдзе ўдарнікаў друку па барацьбе са стратамі ў сельскай гаспадарцы

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Надаць выключна важнае палітычнае значэньне абвешчанаму газэтай ЦК УсеКП(б) «Правда» ўсесаюзнаму рэйду ўдарнікаў друку па барацьбе са стратамі ў сельскай гаспадарцы, які абвешчаны ў адзнаку гадавіны пастановы ЦК аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

2. Абавязаць рэдакцыі ўсіх цэнтральных, гарадзкіх, раённых і шматтыражных газэт, а таксама радыё-друк безадкладна ўключыцца ва ўсесаюзны рэйд ударнікаў друку, кіруючыся тымі ўстаноўкамі, якія даны ў рэдакцыйным артыкуле газэты «Правда» ад 2 жніўня 1932 г.

3. Даручыць культпропу ЦК КП(б)Б склікаць 5 жніўня нараду прадстаўнікоў рэдакцый усіх цэнтральных газэт для праверкі выкананьня гэтай пастановы ЦК.

4. Пастанову апублікаваць у друку. **Сакратар ЦК КП(б)Б — ШАРАНГОВІЧ.**

Прывітаньне Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б —газэце „Рабселькор"

«Рабселькору»—баявой газэце рабселькораў Савецкай Беларусі, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б шле гарачае прывітаньне ў дзень выхаду сотага нумару.

Задача газэты—**НЕ ЗАСТЫЦЬ НА ТЫХ БЯЗУМОЎНА ЗНАЧНЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯХ, ЯКІЯ ЕСЬЦЬ У ЯЕ РАБОЦЕ,** а ўсімі сіламі, усёй сваёй работай забясьпечыць далейшы ўздым **якасьці** работы, сваячасовую мабілізацыю нізавога раённага друку і рабселькораў на выкананьне асноўных гаспадарча-палітычных задач, што ставяцца партыяй, забясьпечыць высокі палітычны ўзровень ва ўсёй рабоце газэты.

Газэта «Рабселькор»—орган Культпропу ЦК, выданьне «Зьвязды»—павінна з яшчэ большай энэргіяй змагацца за самыя ўважлівыя, чулыя адносіны ўсіх зьвеньняў нашага друку да лістоў рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, газэта павінна яшчэ больш узмацніць сваю сувязь з прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі і МТС. Трэба памятаць, што пытаньне аб гэтых лістох, аб іх правільным і поўным скарыстаньні мае вялізарнае прыцыпова-палітычнае значэньне.

«Рабселькор» павінен зараз з асаблівай сілай мабілізаваць нізавы друк і рабселькораў на ўзмацненьне барацьбы за прамфінплян, за 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, на выкананьне задач уборачнай і загатоўчай кампаній і падрыхтоўкі да разьмеркаваньня ўраджаю, як задач, якія забясьпечваюць посьпехі барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва на даным этапе.

Пытаньні **сыстэматычнай** барацьбы за ўзмацненьне **абароназдольнасьці** савецкай краіны, няўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай **нацыянальнай палітыкі,** барацьбы за далейшае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі,—павінны быць заўсёды ў цэнтры ўвагі газэты.

Падкрэсьліваючы значныя дасягненьні газэты, трэба разам з тым зьвярнуць асаблівую ўвагу на зьнішчэньне асобных **слабых месц** у рабоце газэты «Рабселькор», якімі зьяўляюцца не даволі поўная пастаноўка пытаньняў калгаснага гандлю, прасоўваньня тавараў шырокага спажываньня ў вёску і, да апошняга часу, слабая дапамога нізавому друку тарфяных заводаў і прадпрыемстваў па вырабе буданічных матар'ялаў.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б упэўнен, што «Рабселькор» і надалей будзе з гонарам выконваць тыя адказьнейшыя задачы, якія на яго ўскладзены ЦК КП(б)Б, як на кіруючую газэту на пытаньнях рабселькоўскага руху, раённага і нізавога друку, будзе і надалей настойліва і насьляўна змагацца на два фронты, супроць правай—галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў, за генэральную лінію партыі.

Сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б — В. ШАРАНГОВІЧ.

3 жніўня, 1932 г.
г. Менск

Рэдакцыі газэты „Рабселькор"

Вітаю вас з выпускам сотага нумару вашай газэты. «Рабселькор» ужо адыграў вялікую арганізатарскую і палітычную ролю ў справе мабілізацыі шырокіх мас рабочых калгасьнікаў і ўсіх працоўных на выкананьне практычных задач вялікай сацыялістычнай будоўлі і па камуністычным выхаваньні арміі рабселькораў Беларусі. При дапамозе газэты «Рабселькор», якая вядзе няўхільную барацьбу за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку, — вырасьлі новыя сотні і тысячы змагароў на фабрыках, заводах, у калгасах і вёсках, якія ўжо ўключыліся ў практычную працу па будаўніцтве сацыялістычнай гаспадаркі і культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу. Рабселькоры папаўняюць новымі сіламі рады культурных, мастацкіх працаўнікоў і рады пралетарскіх пісьменьнікаў.

У далейшым прадстаяць вялікія задачы па пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. На выкананьне гэтых задач неабходна яшчэ шырэй мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць. Застрэльшчыкамі гэтай мабілізацыі павінны быць рабселькоры працуючы пад кіраўніцтвам нашай партыі і па яе ўказаньнях.

Жадаю посьпехаў у далейшай працы. Пасылаю шчырае прывітаньне ўсім рабселькорам праз вашу газэту.

Няхай жыве камуністычная партыя — падзейны кіраўнік усяго сацыялістычнага будаўніцтва і кіраўнік рабселькоўскага руху!

Няхай жыве т. Сталін—правадыр сусьветнага пралетарыяту!

М. Галадзед.

4-VIII—1932 г.

АБ ВЫНІКАХ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ Ў БССР УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ НІЗАВЫХ ГАЗЭТ

калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, абвешчанага газэтай „Правда“

Пастанова цэнтральнай камісіі пры „Зьвязьдзе“ па кіраўніцтве конкурсам, зацьверджаная Культпропам ЦК КП(б)Б

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту, пасьлядоўна ажыцьцяўляючы дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб перабудове работы нізавога друку і рабселькораўскага руху, пасьцянныя газэты калгасаў, саўгасаў і МТС, як магутная зброя ў руках партыйнай арганізацыі, дасягнулі значных посьпехаў у барацьбе на два фронты, за генэральную лінію партыі, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва на даным этапе.

Нізавы друк і рабселькоры на вёсны зьяўляюцца актыўнымі змагарамі ў барацьбе за правядзеньне мерапрыемстваў партыі і ўраду, у барацьбе супроць кулацтва і яго агентуры правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў.

Абвешчаны ў канцы кастрычніка месяца 1931 г. газэтай «Правда» конкурс нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў зьяўляецца адным з магутных сродкаў ажыцьцяўленьня на справе пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка 1931 году і адпаведных пастаноў ЦК КП(б)Б аб перабудове работы нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Конкурс «Правды» па БССР суправаджаўся далейшым магутным ростам актыўнасьці селькораў у барацьбе за арганізацыю працы ў калгасах, на аснове ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК УсеКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Конкурс суправаджаўся ростам актыўнасьці рабселькораў у барацьбе за канкрэтныя вытворчыя задачы, як пастаноўка ўліку працы, укараненьне зьдзельшчыны, разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі і г. д. Уся гэта работа праводзілася пад знакам барацьбы за самую высокую якасьць работы кожнага зьвяна калгаснай вытворчасьці, за штодзённую работу па сацыялістычным перавыхаваньні калгаснікаў на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Рабселькоры і нізавы друк калгасаў, саўгасаў і МТС дапамаглі мясцовым партыйным арганізацыям у барацьбе за поўнае і своячасовае выкананьне калгасамі плянаў усіх відаў загатовак, у перамаганьні кулацка-месьніцкіх тэндэнцый (Гусарскі сельсавет, Клімавіцкага раёну, насьценгазэты калгасаў Жлобінскага раёну і інш.).

Павялічэньне ў часе правядзеньня конкурсу «Правды» сеткі нізавых газэт, рост арміі рабселькораў, арганічна суправаджаліся барацьбою за рашучае паляпшэньне якасьці работы кожнай з насьценных газэт, за ўменьне арганічна спалучаць апэрацыйную барацьбу за канкрэтныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва з высокім палітычным узроўнем зьместу кожнай газэты.

Задача падрыхтоўкі і правядзеньня 3-яй бальшавіцкай сэсіі была адказнейшай задачай у рабоце нізавога друку і рабселькораў за час конкурсу «Правды». У барацьбе за гэту задачу рад насьценных газэт калгасаў, саўгасаў і МТС, асабліва перадавых раёнаў, у правядзеньні конкурсу паказалі сапраўды бальшавіцкія прыклады мабілізацыі рабочых саўгасаў, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў — адпаасобнікаў на правядзеньне сэсіі ў больш кароткія тэрміны, на выпрацоньне канкрэтных задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

У час конкурсу «Правды» значна ўзьнялася роля друку і рабселькораў у барацьбе за сацыялістычную спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі, больш узмацніпася сувязь раённых, нізавых газэт і селькораў са спэцыялістамі сельскай гаспадаркі (Гомельскі раён — стварэньне пры рэдакцыі агразоатэхнічнага савету, выдаючага для насьценных газэт спэцыяльныя лісткоўкі, рад ініцыятыўных пачынаньняў Клімавіцкім, Лёзьнянскім, Жлобінскім раёнам).

За час работы па конкурсу больш узрасла і ўзмацнілася шэфская дапамога нізавога фабрычна-заводзкага друку падшэфным насьценгазэтам калгасаў і селькорам праз перадачу пешшага вопыту, набытага фабрычна-заводзкім друкам у пастаноўцы сваёй работы, у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, за перабудову работы з рабкорамі. Асабліва значная работа праведзена шматтыражкай заводу «Пралетары» (Гомсельмаш, Гомельскага раёну), заводу «Прафінтэрн», (Віцебск) і шматтыражкамі некаторых прадпрыемстваў гораду Менску.

Партыйнае кіраўніцтва нізавым друкам і работай рабселькораў за час конкурсу «Правды» ўзьнялося на больш высокую палітычную ступень, стала больш канкрэтным.

Гэтаму значна спрыяла пастаноўка пытаньня аб конкурсе на XIV усебеларускім зьезьдзе КП(б)Б і амаль на ўсіх раённых партыйных канфэрэнцыях, выданьне ў 30 раёнах спэцыяльных апэрацыйных бюлетэняў аб ходзе конкурсу «Правды», дырэктывы культпропу ЦК КП(б)Б і раённых камітэтаў партыі на рашаючых этапах конкурсу, правядзеньне выязных пасяджэньняў цэнтральнай конкурснай камісіі, якімі было ахоплена большасьць раёнаў БССР, выпучэньне сельпартарганізатараў па друку ў вучэйках і г. д.

Сацыялістычнае спаборніцтва нізавога друку і рабселькораў БССР, Савецкай Украіны і Паўночна-Каўказкага краю на лепшую работу па правядзеньні конкурсу зьявілася магутным сродкам як у справе яшчэ большай мабілізацыі нізавых газэт і рабселькораў на пасьпяховае ажыцьцяўленьне праграм конкурсу «Правды», так і ў справе пастаноўкі шырокага абмену вопытам работы і яго выкарыстаньня.

Дасягненьні, атрыманыя ў конкурсе «Правды» па БССР, зьяўляюцца прамым вынікам таго, што ўся дзевяцімесячная работа па конкурсу «Правды» праводзілася пад лёзунгам ЦК КП(б)Б «Сława арганізацыі і правядзеньня конкурсу «Правды» — справа ўсёй КП(б)Б, усёй пралетарскай грамадзкасьці БССР».

Падагульўшы па сваіх пасядзеньнях вынікі правядзеньня па БССР конкурсу «Правды», цэнтральная конкурсная камісія пастанаўляе прэміяваць наступныя перадавыя газэты, якія паказалі лепшыя ўзоры на ўсёй рабоце па правядзеньні конкурсу «Правды» на працягу ўсяго часу.

1.

ШТОДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ»** калгасу **«СЛУЧ», СЛУЦКАГА РАЁНУ,** якая паказала прыклад апэрацыйнасьці ў сваёй рабоце, разгарнула масавую работу сярод калгаснікаў, дапамагла забясьпечыць поўнае і своячасовае выкананьне калгасам плянаў усіх відаў загатовак, разгарнула добрую падрыхтоўку і своячасовае правядзеньне 3-яй бальшавіцкай сэсіі, дапамагла арганізаваць работу на СТКФ і практычна дапамагае ў рабоце насьценным газэтам і селькорам вакольных калгасаў, за штодзённае выданьне ў працягу году і за ўцягненьне ў сваю шырока-настаўленую масавую работу большасьці калгаснікаў.

— **ПРЭМІЯВАЦЬ 500 РУБЛЯМІ,** з якіх рэдактара тав. **АРАБЕЯ — 200 руб.,** на паляпшэньне апэрацыйна-масавай работы насьценгазэты — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў ударнікаў — **200 руб.**

2.

ПЯЦІДЗЕННУЮ агульна-калгасную насьценную газэту **«ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛІЗМУ»** калгасу **«Правда»,** Клімавіцкага раёну, якая шырока разгарнула масавую работу з селькорамі (праведзена 6 масавых выездаў селькораў), правяла работу па арганізацыі шырокай сеткі брыгадных газэт, што створаны ва ўсіх брыгадах, арганізавала настаўнічу кіраўніцтва іх работай (правяла 4 нарады рэдактараў і рэдкалегій брыгадных газэт), дапамагла партыйнай ячэйцы арганізаваць масы калгаснікаў па стопроцэнтнае выкананьне плянаў усіх відаў загатовак, пра разгортваньне сацспаборніцтва паміж брыгадамі і праз арганізацыю сацыялістычнага бяжэру перадавых брыгад за здабычы, дапамагла калгасу своячасова і поўнасьцю выканаць пляны веснавой сяўбы, арганізавала масы калгаснікаў на барацьбу з клясава-варожымі элемэнтамі, якія прадзелы і калгас (вычышчаны з калгасу 3 кулацкія гаспадаркі).

ПРЭМІЯВАЦЬ 500 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ЦЕРАШКОВА — 200 руб.,** на паляпшэньне апэрацыйна-масавай работы насьценгазэты — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў—**200 Руб.**

3.

ШТОДЗЕННУЮ агульна-калгасную насьценную газэту **«НА ШТУРМ»** калгасу **«РАСЬСВЕТ ПЕРАМОЖЦА», ЖЛОБІНСКАГА РАЁНУ,** якая паказала яркія прыклады па арганізацыі працы ў калгасе, дамагалася ўвядзеньня зьдзельшчыны на МТКФ і СТКФ, першая ў раёне разгарнула работу па арганізацыі пастаянных вытворчых калгасных брыгад, рашуча выступіла супроць меўшых месца ў калгасе асобных правапартыністычных выступленьняў за скарачэньне пасеўных плянаў, дапамагла партыйнай ячэйцы своячасова стварыць насенны фонд і ў тэрмін скончыць веснавую сяўбу, а таксама ўдзельнічала ў работу насьценгазэты шырокія масы калгаснікаў і правяла ініцыятыву ў арганізацыі сацыялістычнага буксіру для пасылкі ў Снюўраскі раён (УССР), з якім спаборнічаў Жлобінскі.

ПРЭМІЯВАЦЬ 500 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ЗАКРЭЎСКАГА 200 руб.,** на паляпшэньне апэрацыйна-масавай работы насьценгазэты — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў **200 руб.**

4.

ПЯЦІДЗЕННУЮ насьценную газэту **«КАЛГАСЬНІК»** аднаго з буйнейшых калгасаў **БССР «БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ», КЛІМАВІЦКАГА РАЁНУ,** за шырокую работу па арганізацыі калгаснай вытворчасьці праз разгортваньне работы насьценных газэт у калгасных вытворчых брыгадах (арганізавана 47 брыгадных газэт, у тым ліку на СТКФ і птушніцкай ферме), за распаўсюджваньне спаборніцтву з камунай «3-ці Інтэрнацыянал», Ноўтарад—Севэрскага раёну (УССР), за сыстэматычна-настаўленую работу з селькорамі і рэдкалегіямі брыгадных газэт (сыстэматычна праводзяцца нарады рэдкалегій і зьлёты селькораў), за разгорнутую работу ў час веснавой сяўбы, што ў значнай мэры дапамагло калгасу выканаць плян сяўбы поўнасьцю.

ПРЭМІЯВАЦЬ 500 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **КАВАЛЁВА Янку — 200 руб.,** на ўзмацненьне апэрацыйна-масавай работы насьценгазэты — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў **200 руб.**

5.

ШТОДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ШТУРМ»** калгасу **«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ», ЛЁЗЬНЯНСКАГА РАЁНУ,** за праяўленую ініцыятыву ў зборы прапаноў па складаньні вытворча-фінансавага пляну калгасу, за арганізаваны ўнутрыкалгасны конкурс на лепшую брыгаду і брыгадзіра, на лепшую газэту па МТФ, за дапамогу ў зьнішчэньні абязьлічкі ў догляде коняй, чаго газэта дабілася праз арганізацыю пераклічкі конюхоў. Уся разгорнутая работа як агульна-калгасная газэты, так і брыгадных, дапамагла калгасу ня толькі выканаць плян веснавой сяўбы па тэхкультурах, але дабіцца яго перавыкананьня. Праведзена шырокая работа па падрыхтоўцы да ўборкі, для чаго быў арганізаваны «мітынг гумнаў і мапшын». У газэце прымае ўдзел больш 85 калгаснікаў.

ПРЭМІЯВАЦЬ — 500 РУБЛЯМІ з якіх рэдактара тав. **ЗЭЙРАКА — 200 руб.,** для ўзмацненьня апэрацыйна-масавай работы насьценгазэты — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў—**200 руб.**

6.

ШТОДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ЗА ЎДАРНЫ КАЛГАС»** яўрэйскага **НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАЛГАСУ ІМЯ 10-ГОДЗЬДЗЯ БССР, РЭЧЫЦКАГА РАЁНУ,** за актыўную работу па ліквідацыі абязьлічкі на скотным дворы ў догляде жывёлы, за што лепшыя селькоры прэміраваны калгасам.

За ініцыятыву разгортваньня спаборніцтвам з калгасам імя Дзяржынскага, за правядзеньне масавых рэйдаў у часе падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы, выданьне сьпітальных лісткоў, вусных газэт, што дапамагло калгасу забясьпечыць выкананьне пляну сяўбы на 100 проц. Арганізаваны масавы рэйд праверкі гатоўнасьці калгасаў да ўборкі. Газэтай выкрыты факты антысэмітызму і шавінізму. Матар'ялы ў газэце зьмяшчаецца на яўрэйскай і беларускай мове.

ПРЭМІЯВАЦЬ 500 РУБЛЯМІ, з іх рэдактара тав. **РАБІНОВІЧ — 200 руб.,** на паляпшэньне масавай апэрацыйнай работы насьценгазэты — **100 руб.** і для прэміяваньня селькораў-ударнікаў — **200 руб.**

8

Штодзённую насьценную газэту **«НА ШТУРМ»,** саўгасу **ТУРСК, РАГАЧОЎСКАГА РАЁНУ,** за бесьперабойнае, штодзённае выданьне, спалучанае з барацьбой за якасьць зьместу, за аказаную дапамогу насьценным газэтам і селькорам вакольных калгасаў у іх барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў (пасылка брыгад рабкораў для аказаньня дапамогі ў наладжаньні ўліку ў калгасах, увядзеньні вядзельшчыны і г. д.), а таксама **ЗА НАЛАДЖАНУЮ СУМЕСНУЮ РАБОТУ СА СПЭЦЫЯЛІСТАМІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ** (арганізацыя агратэхпрапаганды праз старонкі газэты, удзел спэцыялістаў у рабоце ўдарных брыгад друку), —

ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара — **150 р.,** для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы газэты — **50 руб.** і для прэміяваньня лепшых рабкораў-ударнікаў — **100 рублёў.**

9

ПЯЦІДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ПРАМЕНЬ КАЛГАСЬНІКА»** калгасу **«ЧЫРВОНЫ ТРАКТАР»,** Ельскага раёну, за разгорнутую работу па ўкараненьні агразоатэхнікі ў калгасную вытворчасьць (па ініцыятыве газэты арганізаваны калгасныя курсы па аўладаньні агразоатэхнікай, якімі былі ахоплены ўсе брыгадзіры і калгасны актыў), за разгорнутую работу на падрыхтоўцы да веснавой сяўбы (барацьба за вытворчую брыгаду і за ўсталяваньне правільнага севазвароту ў калгасе), за разгортваньне сацспаборніцтва ў калгасе ў час сяўбы, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБ., з якіх рдактара тав. **СТАНІШЭЎСКАГА — 150 руб.,** для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы газэты — **50 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

10

Насьценную газэту **«ГОЛАС КАМУНАРА»** камуны **«ЛЕНІНСКАЯ БЕЛАРУСЬ», ЖЫТКАВІЦКАГА РАЁНУ,** за праведзеную работу па ўвядзеньні зьдзельшчыны на скотным дварэ, **ЗА РАЗГОРНУТУЮ РАБОТУ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ** у выніку чаго калгасам веснавая сяўба скончана 23 мая, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара 150 руб., на паляпшэньне апэрацыйна-масавай работы газэты — **50 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

11

Насьценную газэту **«ЗА НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ»** калгасу **ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА, РЭЧЫЦКАГА РАЁНУ,** за праведзеную работу па ліквідацыі ў калгасе абязьлічкі, за арганізацыю і забясьпечэньне кіраўніцтва работаю насьценных газэт у пяці вытворчых калгасных брыгадах, за разгорнутую работу ў часе веснавой сяўбы, што дапамагло калгасу выканаць плян на 100 проц., —

ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **МАЎЧАНАВА — 150 рублямі,** на паляпшэньне апэрацыйна-масавай работы газэты — **50 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

12

ТРОХДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ СЬВІНАГАДОЎЛЮ»,** саўгасу **«ВАСІЛЬЛЕЎСК», ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу ў час конкурсу па захаваньні маладняка ад апаросу сьвіней, за адкорм і здачу таварнай прадукцыі (зьніжэн адыход маладняка з 40% да часу ўключэньня ў конкурс да 5 проц. к вясьне 1932 году, пляны здачы таварнай прадукцыі першага кварталу 1932 г. выкананы на 258 проц.), за разгорнутую масавую работу (у час конкурсу праведзена 5 рэйдаў ударнікаў друку, створан вакол газэты рабкораўскі актыў з 43 чалавек), а таксама за разгорнутую работу па падрыхтоўцы да сяўбы і ў часе сяўбы, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара т. **ЦАРАНКОВА — 150 руб.,** на паляпшэньне апэрацыйна-масавай работы насьценгазэты — **50 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

13

ТРОХДЗЕННУЮ насьценную газэту **«КАМУНАРКА»** камуны **«Зьвязда», КАСЬЦЮКОВІЦКАГА РАЁНУ,** якая за час работы па конкурсу стала вядучай у сельсавеце. У камуне арганізавана 16 брыгадных газэт. Выдаюцца спэцыяльныя бюлетэні на СТКФ і МТКФ. Газэта шырока разгарнула падрыхтоўчую работу да веснавой сяўбы (своячасова ссыпан насенны фонд. Па ініцыятыве газэты праз набыцьцё насеннай пазыкі імя конкурсу «Правды» пазычана суседнім калгасам аўса 700 пудоў, бульбы 1.500 пуд., ільнянога семя 144 пуды, узараны і засеяны ўсе закінутыя землі.

ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ЯКУШАВА — 150 руб.,** для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы насьценгазэты — **50 руб.** і для прэміяваньня сельскораў-ударнікаў — **100 руб.**

14.

Насьценную газэту **«ШТУРМ»** калгасу **«ЧЫРВОНАЯ РУДНЯ», ЖЛОБІНСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу па выкананьні плянаў загатовак, што дапамагло калгасу выканаць пляны па ўсіх відах загатовак на 100 проц., за шырокую масавую работу ў час падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы (барацьба за арганізацыю пастаянных вытворчых брыгад і за стварэньне ў брыгадах насьценных газэт, за праведзеную работу па зборы насенных фондаў, праз рэалізацыю насеннай пазыкі.

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ПЕНЯЗЬКОВА — 100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 рублёў.**

16.

ТРОХДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ЗА САЦЫЯЛІЗМ»,** калгасу **«КАМІНТЭРН», СЛУЦКАГА РАЁНУ,** за праведзеную масавую падрыхтоўчую работу да веснавой сяўбы (праведзены рэйды па праверцы гатоўнасьці машын і інвэнтару), за разгорнутую работу ў час сяўбы (сацспаборніцтва, паказ лепшых ударнікаў, што было арганізавана праз газэту, дапамагло калгасу першым у раёне закончыць сяўбу), —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ЯКІМОВІЧА — 100 руб.,** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

17.

Насьценную газэту **«ШТУРМ»,** калгасу імя **КАЛІНІНА, РАГАЧОЎСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы і за **АРГАНІЗАВАНУЮ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНУЮ СУВЯЗЬ З ЗАМЕЖНЫМІ РАБОЧЫМІ І ПРАЦОЎНЫМІ СЯЛЯНАМІ** (Францыі і Нямеччыны),—

Прэміяваць 200 рублямі, з якіх рэдактара тав. **ЧАРНЯЎСКАГА — 100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

18.

Насьценную газэту **«ГОЛАС САЎГАСЬНІКА»,** саўгасу **«БРЫЛЁЎ», ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНУ,** за праведзеную работу па захаваньні ў саўгасе конскай цягавай сілы, за масавую падрыхтоўчую работу да сяўбы і ў час яе, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ЦІМАШКОВУ — 100 руб.,** для прэміяваньня лепшых рабкораў-ударнікаў — **100 руб.**

19.

Насьценную газэту **«КАЛГАСЬНІК»,** калгасу **«ЧЫРВОНЫ БЕРАГ», АРШАНСКАГА РАЁНУ,** за праяўленую ініцыятыву ў арганізацыі калгаснага чырвонага абозу па выкананьні плянаў загатовак, што дапамагло калгасу выканаць плян на 100 проц., за разгорнутую работу ў час падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы, што забясьпечыла 100-процэнтнае выкананьне плянаў на засеву гародных культур,—

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ГАЛЬКЕВІЧА — 100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў—**100 руб.**

20.

Насьценную газэту **«ШТУРМ»,** калгасу імя **СЬВЯРДЛОВА, РАГАЧОЎСКАГА РАЁНУ,** за праведзеную работу па выкананьні плянаў загатовак, што забясьпечыла іх выкананьне на 100 проц., за праведзеную масавую работу на падрыхтоўцы і ў час правядзеньня веснавой сяўбы (рэйды, нарады селькораў разам з калгасным актывам), што таксама забясьпечыла поўнае і своячасовае выкананьне пасеўных плянаў, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **КРАСНАБАЕВУ — 100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

21.

Насьценную газэту саўгасу **«ХАЛЬЧ», ЖЛОБІНСКАГА РАЁНУ,** якая арганізавала масавую работу ў саўгасе і па ініцыятыве якой аказана дапамога вакольным калгасным насьценгазэтам і селькорам у пастаноўцы іх работы, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара 100 руб. і для лепшых рабкораў-ударнікаў — **100 руб.**

22.

Насьценную газэту яўрэйскага калгасу **«САЦВЗГ», ПАРЫЦКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу па падрыхтоўцы і выкананьні плянаў па арганізацыі гародняй гаспадаркі,—

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 руб., з якіх рэдактара — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

23.

Насьценную газэту **«РАЎДОНАСІС ТРАКТОРУС»** літоўскага калгасу імя **ГЕДРЫСА, ЧАВУСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы (арганізаван рэйд праверкі, праведзены нарады селькораў разам з калгасным актывам), за разгортваньне сацспаборніцтва ў час сяўбы, за арганізаваны паказ лепшых ударнікаў і за арганізацыю пасылкі карэспандэнцый на літоўскую газэту «Раўдонасіс Артояс». —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

24.

Насьценную газэту **«ПА ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХУ»** калгасу **«ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА», БАРЫСАЎСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу па арганізацыі калгаснай працы, на аснове барацьбы за пастаянную калгасную вытворчую брыгаду і праз арганізацыю ў брыгадах насьценных газэт, за работу па ліквідацыі абязьлічкі ў догляде коняй і жывёлы, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

25.

Насьценную газэту **«ЗА СЬЦЯГ ПРАВДЫ»,** калгасу **«КАМІНТЭРН», МАГІЛЕЎСКАГА РАЁНУ,** за праведзеную масавую работу з селькорамі (праведзены 4 селькораўскія зьлёты), за разгорнутую работу па барацьбе за сацыялістычную жывёлагадоўлю (пра арганізацыю рэйдаў газэта дапамагла калгасу ліквідаваць абязьлічку на СТКФ і МТКФ, зьнізіць адыход маладняка з 30 проц. да 1,7 проц.) і за аказаную дапамогу ў рабоце насьценных газэт вакольных калгасаў, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара тав. **ФРАЛОВА — 100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

26.

ШТОДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ЎДАРНІК ПАЛЕЎ»,** брыгады № 3 калгасу **«НОВЫ ШЛЯХ», ЛЁЗЬНЯНСКАГА РАЁНУ,** якая разгарнула масавую работу ў брыгадзе ў час сяўбы непасрэдна на полі праз арганізацыю голасных чытак газэт і растлумачэньне пастаноў партыі і ўраду, за разгорнутую работу па мабілізацыі калгаснікаў на ўзьняцьце якасьці сяўбы, чаго газэта дабілася праз паказ лепшых прыкладаў работы, за разгорнутую барацьбу за бярэжлівыя адносіны да коняй, што дапамагло брыгадзе датэрмінова закончыць плян сяўбы. —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 рублямі, з якіх рэдактара тав. **ШЛАПАКОВА П. — 100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 рублёў.**

27.

ШТОДЗЕННУЮ насьценную газэту **ПАЛЯВОДЧАЙ БРЫГАДЫ № 1 КАЛГАСУ «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА», БАРЫСАЎСКАГА РАЁНУ,** за арганізацыю выданьня газэты на полі, за стварэньне вакол яе сельскараўскага актыву, за праяўленую ініцыятыву па зборы насеньня праз распаўсюджваньне насеннай пазыкі (сабрана 15 пудоў ячменю, 20 пудоў аўса і інш.), за арганізаваны мітынг плугоў, што своячасова забясьпечыла рамонт інвэнтару і за арганізаваную барацьбу па ліквідацыі абязьлічкі ў догляде коняй, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара — **100 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

28.

Насьценную газэту вытворчай брыгады № 1 калгасу **«ЧЫРВОНАЯ РУДНЯ», ЖЛОБІНСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу ў час веснавой сяўбы, за рашучую барацьбу супроць гультаёў, прагульшчыкаў, за мабілізацыю калгаснікаў на разгортваньне калгаснага гандлю і поўнае выкананьне распаўсюджваньня пазыкі «чацьвертага заваёўшальнага, —

ПРЭМІЯВАЦЬ 200 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара — **100 руб.,** для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

29.

Насьценную газэту **«ЗА ЎДАРНУЮ СЯЎБУ»** калгасу **«СПАРТАК», КАРМЯНСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу на СТКФ (газэта праз шэфства над сьвінарнікам дабілася ліквідацыі абязьлічкі ў догляде сьвіней, зьнішчэньня адыходу), за арганізаванае спаборніцтва сьвінароў і ўключэньне іх ва ўсесаюзны конкурс на лепшага сьвінара, за разгортваньне масавай работы, а таксама ўжываньне новых форм работы (сьпітальныя лісткі «ордэн працульшчыка»), за арганізаваны курсаў брыгадзіраў, за праведзеную работу па выданьні палявых газэт у чаторых вытворчых калгасных брыгадах,

— **ПРЭМІЯВАЦЬ 400 РУБЛЯМІ,** з якіх рэдактара тав. **КУЛАЧЭНКА — 150 руб.,** для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы газэты — **50 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **200 руб.**

30.

Насьценную газэту **«БУДЗЁНАЎКА» КАЛГАСУ ІМЯ БУДЗЁННАГА, ДРЫСЕНСКАГА РАЁНУ,** за праяўленую шырокую ініцыятыву па ўзмацненьні тэмпаў апрацоўкі ільнавалакна (прыкладная работа селькораў, правядзеньне «ўдарных гадзін» на возцы і інш.), за разгорнутую работу па выкананьні і перавыкананьні пляну загатовак ільнавалакна, за што калгас прэміраваны Калгасцэнтрам БССР, за арганізаваную ў гонар XIV зьезду КП(б)Б звышплянавую здачу калгасам аднэй тоны збожжа і аднэй тоны віку, за разгортваньне масавай работы (праведзен рэйд па праверцы ажыцьцяўленьня 6 умоў т. Сталіна, арганізаваны пробны выезд калгасу ў поле), за паляпшэньне работы на МТКФ (наладжваньне правільнага расходаваньня кармоў), за арганізаванае спаборніцтва з насьценгазэтай калгасу Дрысенскага раёну «Новы шлях» і за арганізацыю калгаснікаў на перавыкананьне пляну па засеву гародных культур,—

ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ, з якіх рэдактара — **150 руб.,** для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы газэты — **50 р.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **200 руб.**

31.

Трохдзённую насьценную газэту **«ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ»** калгасу **«СЛАВА», АСІПАВІЦКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую работу на МТКФ і ліквідацыю абязьлічкі ў догляде жывёлы, за масавую работу (праведзена тры рэйды), за своячасовае ўключэньне ў падрыхтоўку да разгортваньні ўнутрыраённага спаборніцтва на лепшае правядзеньне сяўбы, за распаўсюджаньне насеннай пазыкі, шляхам чаго сабрана насеньня на 9 га гароду, за ўзьнятую ініцыятыву па правядзеньні курсаў брыгадзіраў, за арганізацыю калгаснікаў на перавыкананьне пляну сяўбы і аказаньне дапамогі калгасу «Рэкорд»,

— **ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ,** з якіх рэдактара 150 руб., для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы — **50 р.** і для прэміяваньня лепшых селькораў — **130 руб.**

32.

Пяцідзённую насьценную газэту **«ШЛЯХІ ПЕРАМОГ»** калгасу **«КЛІЧ ЛЕНІНА», ДРЫСЕНСКАГА РАЁНУ,** за праведзеную работу па спэцыялізаваным свайго калгасу (па ініцыятыве газэты праведзена 7 вытворчых нарад калгаснікаў), за зьнижэньне адыходу маладняка на СТКФ да аднаго процанту, за выкананьне канкрэтных праяўленьняў нядбайных адносін да працы, за праяўленую ініцыятыву ў рабоце (падхоплен выклік рабочых кастрамской фабрыкі і арганізаваны на яго водгук калгаснікамі самаабавязацельства па ўзмацненьні барацьбы за добраякасны раньні засеў ільну) і за разгортваньне брыгадных газэт у двух калгасных брыгадах,

— **ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ,** з якіх рэдактара тав. **БАРЧУКА 150 руб.,** для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы — **50 р.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

33.

Трохдзённую насьценную газэту **«ЎДАРНІК»** калгасу **«НОВЫ СЕЛЯНІН», СТАРАДАРОСКАГА РАЁНУ,** за праведзеную работу па ўмацаваньні СТКФ (паляпшэн догляд сьвінаматак, значна зьнижан адыход маладняка, ліквідавана абязьлічка сярод даглядчыкаў), за разгорнутую работу па ўключэньні сьвінароў ва ўсесаюзны конкурс і за арганізаванае спаборніцтва паміж брыгадамі і калгаснікамі, чым газэта дапамагла калгасу поўнасьцю выканаць плян да 1 чэрвеня.

— **ПРЭМІЯВАЦЬ 300 РУБЛЯМІ,** з якіх рэдактара тав. **ШВАНКОВА — 150 руб.,** для паляпшэньня апэрацыйна-масавай работы газэты — **50 руб.** і для прэміяваньня лепшых селькораў-ударнікаў — **100 руб.**

34

ТРОХДЗЕННУЮ насьценную газэту **«ЗА МОЦНЫ КАЛГАС»** камуны **«НОВАЯ КУЛЬТУРА», ДРЫСЕНСКАГА РАЁНУ,** за разгорнутую шырокую масавую работу вакол задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня камуны (праведзена 5 рэйдаў, з якіх адзін на МТФ), за канкрэтную барацьбу і

РСІ павінна зазірнуць у дом адпачынку

(Ліст групы адпачываючых у Ждановічах)

«Мы жывём сёнешнім днём—што заўтра будзе незадома», гэтымі словамі некаторых работнікаў дому адпачынку імя 11 ліпеня можна ахарактарызаваць становішча абслугоўвання адпачываючых у Ждановічах. І сапраўды бяспляпавасьць, поўны самацёк—самая характэрная рыса работы дому.

Пачнем з таго, што дом адпачынку разлічаны на 500 ч., а адпачывае каля 600. Спадзяючыся, што сьвежае, лясное паветра і рака прымусяць адпачываючых прымірыцца з непаладкамі, кіраўніцтва дому зусім закінула важнейшы вучастак работы—харчаваньне. Перабоі ў харчаваньні, адна стайныя, стандартныя мэню, амаль поўная адсутнасьць гародніны—рэзультат самацёку ў кіраўніцтве работай сталоўкі. Загадчык дому т. **Разоскі** не займаецца гэтай справай. Агент па снабжэньні—«чэмпіён» бязьдзейнасьці. Ніякіх дагавораў з калгаса мі не заключана, сьпіжарня сталоўкі пустае. Сьвіназадкормачны пункт—бяз сьвіней, сталоўка жыве тым, што набывае жывёлу на прыватным рынку.

І, нарэшце, злачынна слабы кантроль за расходваньнем прадуктаў. Ёсьць выпадкі разбазарваньня прадуктаў. Штат дому ў 100 з лішнім чалавек харчуецца бяз усякіх норм і «набірае вагу». Не работа, а сапраўдная дача.

Характэрны факт. Рысам, што застаецца пасьля абеду (а яго не шкадуюць)—вострадэфіцытным, неабходным для дзіцячых сходаў і ясьляй, кормяць... сьвіней. Новая загадчыка сталоўкі, нядаўна прысланая «гас падыня» — як не называюць у доме, сама адзначае поўны самацёк у снабжэньні, сама прызнаецца ў сваім бясьсільлі, бо яна не сустракае ніякай дапамогі. Так абстаіць справа з харчаваньнем.

Ня лепш з культабслугоўваньнем. Ёсьць у доме платныя культработнікі і фізкультурнік.

Плян культработы сыстэматычна зрываецца. То кіно-фільма ня прыбыла, то механік папоў у лес, то лектара не знайшлі. Чытальні ў доме няма. Кідаюць груду газэт на стол на вольным паветры, і праз мінуту—дзьве іх няма—зьнікаюць на дачах. Газэты ў кіёск прыбываюць са спазьненьнем. За апошнія 11 дзён была толькі 1 лекцыя. Фізкультурнік займаецца тым, што раніцай запрашае жадаючых на зарадку, або здаваць нормы. Ён зусім ня цікавіцца тым, каб уцягнуць як мага больш людзей у фізкультработу.

Прабелы ў культрабоце запаўняюць: жабрак-скрыпач, які сабірае «даніну» з адпачываючых (страрадаўнія матывы яўрэйскіх вясельляў), або мясцовы хлапец — якісьці аматар—нязьменны акампаніятар на танцульках, што наладжваюцца на начох на эстрадзе тэатру. Па дачах дзе-нідзе захацяюцца гульнёй ў «ачко».

Ёсьць у доме доктар і сястра. Яны займаюцца чыста тэхнічнай работай, рэгіструюць прыяжджаючых і ніякай санасьветнай работы не вядуць. Доктар Бякроўскі абмежаваўся зусім няўдалай, сапраўды юмарыстычнай лекцыяй аб карысьці купаньня («рыбляне загінулі таму, што ня купаліся») і аб клапох—«ворагах пралетарыяту». Яго шчасьце, што ніякіх сур'ёзных захворваньняў ня было.

За ўвесь час адпачынку—12 дзён—ні разу не зьмянялі бялізну. У пакоях брудна і раздольле клапам. Загадчык дому на скаргі адпачываючых спакойна адказвае: «Не хвалюйцеся, вы прыехалі адпачываць».

Становішча дому патрабуе неадкладнага аздараўленьня. Патрэбна ўмяшаньне органаў КК-РСІ.

Адпачываючыя.

Антысэміт Фамін разбурае гаспадарку 5 машына-дарожнага атраду

(Па лістох рабочых)

Яшчэ ў першай палове ліпеня раённая Лепельская газэта пісала аб рабоце машына-дарожнага атраду № 5, начальнікам якога зьяўляецца прараб Фамін.

У атрадзе ігнаруюцца 6 умоў тав. Сталіна, дрэнна пастаўлена грамадзкае харчаваньне. Ня гледзячы на неадпаразовыя запатрабаваньні рабочых, сьнеданьня на лінію ня вывозяць. Фамін надзвычай груба адносіцца да рабочых, асабліва да практыкантаў. Апошнім паводле загаду Фаміна выліжана зарплата са 138 руб. да 75. Аб усім гэтым сыгналізавала лепельская газэта. Аднак яе сыгналы засталіся не пачутымі. Фамін і да гэтага часу, мэтадамі голага адміністраваньня, заціскам самакрытыкі працягвае разбураць гаспадарку МДА—5, зрываць прамфіплян атраду.

Нядаўна, рэдакцыяй газэты «Зьвязда» атрыманы 3 лісты ад рабочых з 14 дарбудвучастку, якія досыць поўна характарызуюць рэботу МДА — 5 і асабліва яго начальніка Фаміна.

Прайшло ўжо 2 з пал. месяцы з таго часу, як на 14 дарбудвучастак прыбыў машына-дарожны атрад № 5, які павінен быў у першых лічбах верасьня закончыць машына-дарожныя работы на вучастку. Аднак выкананьне гэтага пляну сарвана. На сёнешні дзень атрад напалову закончыў толькі каля 700 мэтраў прафіліроўкі.

Хто-ж вінаваты ў гэтым?

Перш за ўсё Фамін. Рабкоры паведамляюць, што з прычыны яго нядбайных адносін да справы, на вучастку 1 з пал. месяца трактары стаялі без работы, больш 3 тыдняў не працавалі грэдары. Чаму? Фамін тлумачыць гэта тым, што ня было каму на грэдарох працаваць. А між тым, да яго прыходзілі грэдарысты, якія працавалі ў гэтым-жа атрадзе, і давалі згоду кіраваць машынамі. Фамін чамусьці адмовіўся ад іх прапановы.

Аднэй з асноўных прычын зрыву работы атраду зьяўляецца яшчэ і тое, што ў ім адсутнічае плянавасьць работы. Ні адзін рабочы ня ведае, што, калі і як яму трэба рабіць. За апошнія 2 з пал. месяцы Фамін толькі 2-3 разы выяжджаў на лінію работ.

Чым-жа, нарэшце, займаецца начальнік МДА—5?

У сваіх лістох рабкоры 14 дарбудвучастку піпуць аб тым, што Фамін вядомы кожнаму рабочаму, як чалавек, які ўсю сваю «работу» зводзіць да голага адміністраваньня, да грубай лаянкі рабочых. Такавы мэтады «кіраўніцтва» Фаміна, якія прывялі да таго, што 15 чэрвеня чатыры трактарысты пакінулі працаваць на вучастку.

Горш за ўсё Фамін адносіцца да рабочых і служачых яўрэяў. Кожнаму з іх ён стварае такія ўмовы працы, якія прымушаюць работніка кінуць працу. Ня так даўно меў месца такі выпадак. Да атраду былі прыкамандаваны 3 практыканты з Віцебскай школы дарбудвучу—Гельман, Гертман, і Скітаў. Усе яны вучні аднэй школы, з аднэй адукацыяй і могуць справіцца з аднэй і тэй жа работай. Між тым Скітаву Фамін вызначыў стаўку ў 103 руб., а другім двум яўрэям—па 75 руб. Мала таго. Заўзяты антысэміт Фамін аддаў загад... зьняць Гельмана і Гертмана з забесьпячэньня харчаваньнем. І гэта таму, што яны... «многа ядуць».

Аналёгічная справа была і са студэнтамі Менскага аўтадарожнага інстытуту, якіх прыслалі ў распараджэньне 5-га машына-дарожнага атраду. Сярод гэтых студэнтаў быў адзін яўрэй—тав. Хаўкін. Ён сумленна выконваў даручаныя яму абавязкі, працуючы тэхнікам атраду, прымаў актыўны ўдзел у грамадзкай працы, выступаў на сходах, сьмела выкрываў недахопы ў рабоце атраду. Не падабалася гэта Фаміну. Ён з мэтай пазбавіцца ад Хаўкіна, бяз усякіх падстаў на гэта, прызначае яго рабочым. Калі-ж тав. Хаўкін пачаў пратэставаць супроць такога распараджэньня, Фамін пазбавіў яго права карыстацца харчаваньнем і, нарэшце, зволіў з працы.

Група рабкораў 14 дарбудвучастку настойліва патрабуе ад адміністрацыі вучастку неадкладнага рэагаваньня на гэтыя абураючыя факты. Антысэміт Фамін, чалавек, які зьдзекваецца над рабочымі, не павінен стаяць на чале адказьнейшага вучастку работы.

* * *

Рэдакцыя «Зьвязды» чакае тэрміновага адказу ад адміністрацыі 14 дарбудвучастку па закранутых ў гэтым артыкуле пытаньнях.

У ЛЁЗЬНЕ І БЕШАНКОВІЧАХ НЯ КІРУЮЦЬ КАЛГАСНЫМ ГАНДЛЕМ

За два месяцы—толькі адзін базар

ЛЁЗНА. (Наш кар.).

2 месяцы таму назад у Лёзьне адбыўся першы калгасны базар, у якім прынялі ўдзел 39 калгасаў, многа калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Была прадана значная колькасьць с.-г. прадукцыі, цэны пайшлі ўніз.

Пасьля першага базару мясцовыя арганізацыі дэмабілізаваліся. Цяпер калгасы на базар амаль не выяжджаюць. Цэны зноў рэзка ўзьняліся.

Маўчаць, бязьдзейнічаюць раённыя арганізацыі. Колькі разоў райком партыі «напамінаў» РВК, міліцыі, райспажыўсаюзу аб іх абавязках, але... дарэмна. Ніхто нічога ў гэтай галіне ня робіць. На базары грязь, ямы. Людзі топчуцца дзе папала—на вуліцах, завулках, тратуарах. Няма чайной, няма заезджага дому для калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Чаму пасьля добрых вынікаў першага калгаснага базару наступіла такое зацішша?

Яшчэ 5 чэрвеня «Зьвязда» сыгналізавала, аб тым, што посьпехі і недахопы першага базару не падагулены, ня вывучаны, ня выкарыстаны для больш шырокага разгортваньня калгаснага гандлю. Сыгнал ня быў пачуты. Усю справу калгаснага гандлю раённыя арганізацыі пусьцілі на самацёк. Ня толькі на самацёк, але дапусьцілі папаваньне на базары перакупшчыкаў-спэкулянтаў.

Гэтымі днямі на агульна-раённым парт сходзе абгаварваліся вынікі аб'яднанага ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. Пастанавілі: «дабіцца пералому ў калгасным гандлі».

Трэба, каб гэтая пастанова не засталася на паперы. Абавязак усёй партыйнай арганізацыі Лёзьнянскага раёну дабіцца сапраўднага карэннага пералому ў калгасным гандлі.

МІКУЦКІ.

Скажаюць прынцыпы калгаснага гандлю

БЕШАНКОВІЧЫ.

Калгасны гандаль на Бешанковіцкім раёне зусім не разгорнут. Замест 40-50 калгасаў на савецкі базар выяжджаюць толькі 2-3 калгасы.

Наглядаюцца выпадкі, калі калгас, выканаўшы плян здачы малака ўсяго на 9 проц., праз дзень возіць малако на базар («Чырвоны баец»). Калгас «Рэйтэ-Фэльд», Хоцімскага сельсавету, амаль кожную нядзелю вывозіць мяса на базар, у той час, як квартальнае заданьне па мясу выканана толькі на 60 проц.

Кантора Малакацэнтру, райкалгасаюз ня прымаюць ніякіх мер супроць тых праўленьняў калгасаў, якія, ня выконваючы цэнтралізаваных плянаў, вывозяць прадукцыю на рынак і тым самым скажаюць дырэктывы партыі і ўраду аб калгасным гандлі.

С. П.

Узьняць шляхавую гаспадарку чыгункі

ГОМЕЛЬ. Хутка па чыгуначных рэйках пойдуць патокі асеньня-зімовых грузаў. Здаровы паравоз і здаровы вагон павінны ісьці па добра прыстасаваным шляху. Шляхавая гаспадарка—адзін з асноўных зьвеньняў у рабоце чыгункі,—не павінна затрымліваць саставы са збожжам, будматар'ыламі і г. д.

На Гомельскім вузьле шляхавая гаспадарка знаходзіцца ў нездавальняючым стане. Дырэкцыя дарогі і раён з вялікім спазьненьнем спускаюць пляны работы ў нізы. Так, на другі квартал 26-я дыстанцыя атрымала пляны і каштарысы толькі... 17 ліпеня. Няма плянавага забесьпячэньня матар'ыламі і ўвязкі паміж вызначанымі планамі работ і фінансаваньнем. Так, напрыклад, на зьмену шпал паводле пляну вызначана на дыстанцыю 45.795 руб., а пераведзена толькі 13.500 руб. Усе гэтыя прычыны, а таксама невыстарчальная барацьба мясцовых арганізацый за выкананьне пляну прывяла да таго, што ў другім квартале па 26-й дыстанцыі плян зьмены рэек выканан усяго толькі на 2,1 проц., а пераводных брусьсяў—на 87 проц.

Дрэнна арганізавана праца на дыстанцыі. Брыгады існуюць толькі фармальна. Фактычна-ж ніякага спаборніцтва няма. Сярод рабочых, якія ў асноўным прыходзяць з вёскі, не вядзецца ніякай палітычна-масавай работы. Кіраўнікі тлумачаць гэта ад сутнасьцю чырвонага кутка.

Дрэнная арганізацыя працы, ігнараваньне культурна-бытавога абслугоўваньня прывялі да вялікай цякучасьці рабочай сілы, якая дасягае 50 проц.

Наогул вынікі падрыхтоўкі шляхавай гаспадаркі да асеньня-зімовых перавозак па Гомельскім вузьле яўна нездавальняючыя. Час, які застаўся, трэба максымальна скарыстаць, каб падцягнуць гэты вучастак. На аснове выкананьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна, баявой мабілізацыі шляхавікоў забясьпечым пасьпяховае выкананьне задач, якія пастаўлены перад шляхавай гаспадаркай у надыходзячы пэрыяд асеньня-зімовых перавозак. Здаровы паравоз і здаровы вагон павінны пайсьці па здаровых шляхох.

Н. Гасман.

Працоўныя Гомельшчыны рыхтуюцца да тыражу

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Працоўныя Гомельшчыны па-ўдарнаму рыхтуюцца да 7 тыражу пазыкі «3 рашаючы». Уся падрыхтоўка праходзіць пад лёзунгам выкананьня фінпляну 3 кварталу ня менш, чым на 50 проц. да пачатку тыражу, 100 проц. ахопу рабочых пазыкай «4 заключнага» і афармленьня падпіскі.

На заводах імя Ланцуцкага, Сельмаш, «Пралетары», фабрыках «Камінтэрн», Палесдрук і радзе іншых прадпрыемстваў праводзіцца масавая растлумачальная работа, прысьвечаная тыражу. На заводзе Сельмаш абвешчан дэкадник па выкананьні фінпляну. Рабочыя заводу ўзялі на сябе самаабавязацельствы, забясьпечыць 100-проц. ахоп падпіскай на пазыку, асабліва новых рабочых, а таксама выканаць кантрольныя лічбы па ўкладах у ашчадкасу і страхаваньні жыцьця рабочых. Гомсельмаш выклікаў на сацспаборніцтва заводы імя Ланцуцкага і «Пралетары».

Фабрыка «Камінтэрн» арганізавала спэцыяльную масоўку за горадам з мэтай папулярызацыі і растлумачэньня важнасьці правядзеньня тыражу ў адным з буйнейшых пралетарскіх цэнтраў БССР — Гомелі.

Пры гаркоме партыі арганізавана камісія па падрыхтоўцы да правядзеньня тыражу, якая ўжо склікала нараду ўсіх трыкутнікаў прадпрыемстваў гораду, намецілі плян.

9 жніўня будзе праведзена вялікая палітмасоўка ў парку культуры і адпачынку з удзелам усіх працоўных гораду. 10 жніўня на калгасным базары таксама будзе праводзіцца мітынг, прысьвечаны тыражу.

Першыя дні падрыхтоўкі далі 8.000 р. прыліву ў ашчадкасы. На фабрыцы «Камінтэрн» падпіска на пазыку «4 заключны» была аформлена толькі на 116 тыс. руб. За дні-ж падрыхтоўкі да тыражу афармленьне падпіскі павялічылася да 156.250 руб. Прыліў у ашчадкасу заводу імя Ланцуцкага складае 2.000 руб.

Аднак, разам з гэтым трэба адзначыць, што ня ўсе яшчэ прадпрыемствы Гомелю ўзяліся як сьлед за разгортваньне падрыхтоўчай работы да тыражу (ф-ка «Вэзувій», гарбарня, шчацінная і інш.).

Г.

10 жніўня—юбілей „ЗЬВЯЗДЫ“

15-годзьдзе „Зьвязды“ адзначым ударнай уборкай збожжавых без малейшых страт

Да ўсіх калгасьнікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў Слуцкага раёну і БССР

БССР, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і яго баявога органу «Зьвязды», дасягнула разам з усімі працоўнымі Савецкага саюзу вялізарных посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Вынікі пасеўнай кампаніі г. г. паказалі, што СССР канчаткова ўмацаваўся на сацыялістычным шляху.

Пад кіраўніцтвам Слуцкага РК КП(б)Б і практычнай дапамозе парт'ячэйкі наш калгас «**СЛУЧ № 2**» з 10 двароў у 1929 г. вырас у гэтым годзе да 105 двароў, на плошчы ў 716,5 га пахаці і сенажаці.

Плян веснавой сяўбы гэтага году выкананы намі на 97 проц. Па тэхкультурах — на 99 проц. і па кармох — на 259 проц.

Зразумеўшы палітычную важнасьць своечасовай уборкі ўраджаю, якая (уборка) замацоўвае посьпехі пасеўнай, мы поўнасьцю ўжо скончылі ўборку азімага на плошчы 115 га. Убраная азіміна засьціравана.

Гэтага мы дабіліся на аснове шырокай масавай работы сярод калгасьнікаў і разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы. У нашым калгасе 7 вытворчых брыгад. Кожная брыгада штодзенна выдае сваю газэту. У калгасе налічваецца 65 актыўных селькораў.

Выхад калгасьнікаў на работу акуратны.

Мы шмат адсталі ва ўборцы сенажаці. Убрана ўсяго 40 проц. Абавязваемся ў бліжэйшыя дні скончыць уборку сенажацей.

Да 15-цігадовага юбілею ЦО КП(б)Б «**Зьвязды**» — змагара за генэральную лінію партыі, за сацыялістычную Беларусь мы ўдарна прыступаем да абмалоту збожжа і да 15 жніўня рыхтуем чырвоны абоз са збожжам у 350 пуд.

Мы абавязваемся да 20 жніўня стварыць насенны фонд жыта і 25 жніўня распачаць асеньнюю сяўбу.

Мы просім райкалгасаюз, РВК і інш. установы зьмяніць назву нашага калгасу «Случ № 2» на імя «15-цігодзьдзя Зьвязды».

Мы заклікаем усіх калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і працоўных аднаасобнікаў да юбілею «Зьвязды» скончыць уборку сенажацей, па-ўдарнаму правесьці ўборку яравых без малейшых страт, па-бальшавіцку прыступіць да сяўбы азімых і арганізавана выйсьці на савецкія рынкі з прадуктамі с.-г. вытворчасьці.

На даручэньні агульнага сходу:

Старшыня калгасу — ЛЕАНОВІЧ Л.

Калгасьнікі-ўдарнікі — **Самусевіч Х., Гурленя М., Новік Х., Самусевіч Ц., Арабей А., Чыж Т., Леановіч Т.**

„Абяцаем змагацца за савецкі гандаль“

Работнікі прылаўку адзначаюць юбілей „Зьвязды“ канкрэтнымі самаабавязацельствамі

Мы, работнікі прамтаварных ларкоў на савецкіх рынках — удзельнікі парады, скліканай газэтай «Віцебскі пралетары» і гаркомам саюзу работнікаў кааперацыі і гандлю **ў адзнаку 15-гадовага юбілею ЦО КП(б)Б «Зьвязды»**, бярэм на сябе канкрэтныя абавязацельствы па хутчэйшам рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю і прасоўваньні тавараў на вёску.

Абавязваемся весьці жорсткую барацьбу са спэкулянтамі-перакупшчыкамі і пільна сачыць за тым, каб тавар не попадаў спэкулянту. Будзем рашуча выкараняць з нашых радоў тых работнікаў, якія прадаюць тавары спэкулянтам і гэтым самым дэзарганізуюць калгасны гандаль.

Абавязваемся дакладна вывучаць попыт, каб закупаць тавары тых асартымэнтаў, якіх патрабуе спажывец. Будзем адмаўляцца прадаваць нядобраякасны тавар.

Мы абавязваемся мець ня толькі прэйскурант тавараў у ларку, але і абвяшчаць аб прыбыўшых новых таварах, наладжваць выстаўкі, арганізоўваць насьценгазэты, вітрыны нядобраякасных тавараў і г. д.

У кожнай гандлёва-кааперацыйнай арганізацыі павінен быць вылучан спэцыяльны работнік, які адказваў бы за снабжэньне ларкоў і праводзіў няплянавыя закупкі тавараў.

Лічым, што ларкі на рынках павінны быць не універсальнымі, а спэцыялізаванымі, г. зн. асобныя ларкі з начыньнем, гаспадарчымі таварамі і інш.

Просім саюз як мага хутчэй арганізаваць на Магілеўскім і Смаленскім рынках мясцкомы, зьнішчыць ураўнілаўку ў зарплаце, увесьці вядзельчыну, якая б сапраўды стымулявала павялічэньню тавараабароту і зацікаўленасьці работніка.

На нашых рынках у Віцебску яшчэ ня вызначаны час гандлю, няма міліцэйскіх пастоў, правіл унутранага распарадку. Перакупшчык-спэкулянт перашкаджае разгортваньню калгаснага гандлю.

Лічым, што стварэньне базарных камітэтаў пры актыўным удзеле работнікаў прылаўку і ўсёй рабочай грамадзкасьці дасьць магчымасьць ператварыць базары ў савецка-культурныя гандлёвыя пункты, якія закліканы адыграць значную ролю ў паляпшэньні снабжэньня працоўных сельска-гаспадарчымі прадуктамі.

Мы абяцаем змагацца за савецкі гандаль так, як вучыць нас гэтаму камуністычная партыя і яе цэнтральны орган—«Зьвязда».

Шнепава, Зубрыцкая, Дымшыц, Зямляннкер, Баранаў, Брумін, Бліцштэйн, Зарэцкая, Прус, Сьвінкін, Ханін, Паташнікава, Клябанава, Спакойны, Штэйн, Бабёр, Ханіна, Левін, Рубін, Левіт, Цыпкіна і інш.

Абавязуюся выканаць заданьне па падпісцы на „Зьвязду“

Да 15-годзьдзя існаваньня Цэнтральнага Органу КП(б)Б газэты «Зьвязда» абавязуюся поўнасьцю выканаць па Аршанскім раёне даданы нам кантрольны заданьні—3.500 экз. «Зьвязды». На сёнешні дзень выканана 3.200 экз., разгорнута шырокая праца па поўным выкананьні і перавыкананьні кантрольных лічбаў.

Загадчык Аршанскага райбюро. Саюздруку — ПАШКЕВІЧ.

Уключаемся ва ўсесаюзны рэйд ударнікаў друку

«Зьвязда» ўключаецца ва ўсесаюзны рэйд ударнікаў друку па барацьбе са стратамі ў сельскай гаспадарцы, абвешчаны газэтай «Правда».

Рэйд ударнікаў друку, у сувязі з 15-годзьдзем «Зьвязды», у сельскай гаспадарцы цалкам і поўнасьцю павінен быць падпарадкаван задачам усесаюзнага рэйду.

Уцягнуць усіх калгасьнікаў і рабочых саўгасаў у актыўную барацьбу са стратамі — першачарговая задача рабселькораў — удзельнікаў рэйду.

АГЛЯД ДРУКУ

Ліст і „скрынка“...

(„Маяк камуны“, Быхаў)

На апошнай паласе «**Маяка камуны**» час ад часу зьмяшчаецца лёканічная абвестка: «Таварышам карэспандэнтам». Ня цяжка дагадацца, што гутарка ідзе пра так званую «паштовую скрынку», хоць рэдакцыя і дала ёй некалькі новую шыльду. Іншых сродкаў сувязі з масамі, апрача гэтай самай «паштовай скрынкі», рэдакцыя, відавочна, не прызнае. Навошта лішнія клопаты, калі ў поўным распараджэньні рэдакцыі ёсьць стандартныя штампы для адказаў на лісты рабселькораў...

Хто ня помніць, што ўяўлялі сабой яшчэ ў недалёкім мінулым «паштовыя скрынкі». Не сакрэт, што адказы рабселькораў праз «паштовыя скрынкі» ў цэлым радзе выпадкаў мелі характар бюракратычных, чыноўніцкіх адпісак. «Ваша заметка спазьнілася», або «Не падыходзіць, пішэце больш канкрэтна», ці, нарэшце, проста і безапэляцыйна: «Друкавацца ня будзе»,—такой, як правіла, была мова «паштовых скрынак».

Што давалі рабселькорам падобныя, з дазволу сказаць, адказы? Зразумела, нішто. Яны ня вучылі іх, як трэба і аб чым пісаць у газэту, не дапамагалі ім расьці і павышаць свой вопыт, адштурхоўвалі іх ад газэты. Жыцьцё даўным-даўно адкінула ў бок «паштовыя скрынкі» такога тыпу. Нашы газэты пераходзяць на новыя апэрацыйныя формы кіраўніцтва рабселькораўскай работай. Вырасла і мацнее з кожным днём жывая, непасрэдная сувязь друку з масамі.

На гэты шлях рэдакцыя «Маяка камуны», відаць, упарта не жадае станавіцца. Яна чапляецца рукамі і нагамі за старыя, аджылыя і, па сутнасьці, школьныя формы работы. Справа, зразумела, ня ў тым, што газэта зьмяшчае на сваіх старонках «паштовую скрынку». Рэдакцыя, на жаль, сьвята захоўвае ўсе горшыя традыцыі гэтых «скрынак», а іменна: бюракратызм, казённыя адносны да ліста рабселькора, якія часта перарастаюць у бяздушнае чыноўніцтва і г. д.

«РЭДСЬКІНУ, ШАБЛОЎСКАМУ, ЯСНАМУ, РУТКОЎСКАМУ, КАЛЮЧЦЫ, КАЛГАСЬНІКУ, БЕЛАЧКІНУ (сьледуе яшчэ цэлы рад прозьвішчаў і псэўдонімаў, рэд.). **ВАШЫ ДОПІСЫ Ў ДРУК НЯ ПОЙДУЦЬ, ПІШЭЦЕ НАМ БОЛЬШ КАНКРЭТНА І ЎГРУНТАВАНА»...**

Так газэта адказвае на лісты, якія паступаюць у рэдакцыю. Так, яна, калі хоча це, інструктуе сваіх рабселькораў. Што значаць словы «больш канкрэтна і ўгрунтавана» рэдакцыя прадастаўляе меркаваць самім рабселькорам. Няхай дагадваюцца, чаму іх лісты напісаны, так сказаць, «менш канкрэтна і ўгрунтавана», чаго ў іх допісах не хапае, што трэба канкрэтызаваць і дапоўніць. Рэдакцыя паставіла штамп «у друк ня пойдзе» і на гэтым сваю місію канчае. Лісты рабселькораў адным росчаркам пяра асуджаюцца на пахаваньне ў рэдакцыйным архіве. Газэта не дае рабселькору зразумелага адказу на ліст, не растлумачвае яму слабых бакоў зьместкі, ня навучыць, як трэба выправіць недахопы карэспандэнцыі. «Маяк камуны» ідзе, мякка кажучы, па лініі найменшага супраціўленьня. Ён чакае, пакуль лістоў не набярэцца салідная куча, каб потым адразу агулам накласьці на іх рэзалюцыю: «У друк ня пойдзе, пішэце больш канкрэтна і ўгрунтавана...». Адвіска зроблена, рэдакцыя можа быць спакойна...

Іншы раз (**прычым даволі часта**) рэдакцыя нават не страхуе сябе і гэтай формулай: «Пішэце больш канкрэтна і ўгрунтавана», вартай сапраўднага бюракрата. Яе адказы на лісты заключаюцца нярэдка проста ў двух словах:—«друкавацца ня будзе». Чаму? Што за прычыны? Невядома. Гэта—тайна рэдакцыі.

«МІХАЙЛОЎСКАМУ. Друкавацца ня будзе. СЕЛЬКОРУ. Друкавацца ня будзе. ВАЕНКОРУ. Друкавацца ня будзе».

«Друкавацца ня будзе» і кропка! Вось і даведайся, у чым справа. Такава ня «паштовая скрынка» «Маяка камуны»! Дапусьцім, што той ці іншы ліст ня можа быць зьмешчан у газэце. Значыць трэба бяз ўсякага адтэрмінованьня даць аўтару поўны і дакладны адказ, растлумачыць яму, чаму ліст не зьмяшчаецца, паведаміць аб далейшым лёсе карэспандэнцыі, аб мерах, прынятых у сувязі з яго заметкай. А рэдакцыя «Маяка камуны», як бачыце, проста **не жадае размаўляць з сваімі рабселькорамі**. Усю справу «вырашаюць» чыноўніцкая бяздушная адпіска, стандартны, бюракратычны штамп: «Друкавацца ня будзе». Гэты штамп газэта культывуе ў розных формах, што, зразумела, ніколькі не мяняе зьместу. Словы іншыя, сутнасьць—тая-ж. З дзіўнай пасьлядоўнасьцю рэдакцыя частуе рабселькораў беспаваротным і катэгарычным, ні чым не растлумачаным адказам.

«АДЗІНЦОВУ. У друк ня пойдзе. КАЛГАСЬНІКУ. Таксама. КАДРАВІКУ. Таксама. БАЧЫЎШАМУ. У друк замет ка ня пойдзе. КАМСАМОЛЬЦУ. Таксама».

Цяжка знайсьці большую зьнявагу да рабселькораўскіх лістоў, большае закасьцяненьне, адрыў ад жывых людзей. Бывае, праўда, што рэдакцыя практыкуе і іншую форму адказаў, у прыватнасьці ў адносінах тых лістоў, якіх, відавочна, няк нельга абвінаваціць у «неканкрэтнасьці», або накіраваць іх адным махам у нетры рэдакцыйнага архіву. У такіх выпадках рэдакцыя вельмі любіць адсылаць лісты «на расьсьледваньне» і «для прыняцьця мер»:

«КАМСАМОЛЬЦУ. Ваш допіс накіраваці ў райкалгасаюз ДЛЯ РАСЬСЬЛЕДВАНЬНЯ І ПРЫНЯЦЬЦЯ МЕР. КАЛГАСЬНІКУ. Заметку накіравалі ў райкалгасаюз для расьсьледваньня і прыняцьця мер. ПРАСІЦЕЛЯМ. Допіс накіраван у райкалгасаюз для расьсьледваньня і прыняцьця мер. ДЗЯМІДАВУ. Заметка накіравана ў райкалгасаюз для высьвятленьня фактаў і ўрэгуляваньня гэтага пытаньня. МАРГУНОВУ. Допіс друкавацца ня будзе. Мы яго накіравалі ў райкалгасаюз для высьвятленьня фактаў і прыняцьця мер».

І так, штамп № 3—«накіравалі для расьсьледваньня і прыняцьця мер». Вядома, паасобныя лісты патрабуюць папярэдняй праверкі або расьсьледваньня. Гэта зусім элемэнтарная рэч. Але, што за сваяасаблівая тактыка ў «Маяка камуны»? Рэдакцыя або абвінавачвае лісты ў тым, што яны, так сказаць, не даволі «канкрэтны і ўгрунтаваны», або сьпешна адсылае іх «на расьсьледваньне і для прыняцьця мер». Што за падаропная боязьнь самой, праз рабселькораў выкрываць недахопы і скажэньні? Што за мэтад хаваецца за плечы раённых арганізацый. Няўжо-ж рэдакцыя зусім не давярае сваім рабселькорам? Напэўна так, бо чым інакш вытлумачыць тэтыя бясконцыя адказы: «Друкаваць ня будзем, паслалі для расьсьледваньня і прыняцьця мер...».

Нядаўна ў цэнтральным друку былі апублікаваны матар'ялы аб сур'ёзных скажэньнях рэвалюцыйнай законнасьці ў Быхаўскім раёне. Брыгада ЦК КП(б)Б выкрыла ў радзе сельсаветаў гэтага раёну (Іскаскім, Зімніцкім і інш.) агідныя факты правай практыкі і «лівацкіх» перагібаў. Раённая-ж газэта маўчыць. Цэнтральны друк піша, а «Маяк камуны» нібы ў рот вады набраў. Мы прагледзелі камплект газэты за апошнія месяцы — красавік-ліпень. І што-ж? Апрача некалькіх невялікіх і дробных заметак аб тых ці іншых недахопах у калгасах раёну—больш амаль нічога няма. За гэты час «Маяк камуны» зьмясьціў усяго адну маленькую заметку аб паасобных фактах парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, ды і то без рашучых вываадаў, без належнай палітычнай ацэнкі. А фактаў, аб якіх трэба сыгналізаваць, якія трэба выкрываць, у раёне, на жаль, даволі. Прыходзіцца-ж пісаць аб іх цэнтральнаму друку, прыходзіцца-ж газэце так часта і з такой ахвотай пасылаць шматлікія лісты рабселькораў «на расьсьледваньне і для прыняцьця мер».

Рабселькоры сыгналізуюць, а газэта на хоча даваць месца для іх сыгналаў на сваіх старонках, ня хоча сама гаварыць поўным голасам. Дзіўныя мэтады самакрытыкі ў быхаўскай газэце!

Яшчэ адна цікавая і характэрная дэталь. Амаль усе заметкі, якіх відавочна мінула «паштовая скрынка», падпісаны ў газэце псэўданімамі. «Скура», «Звон», «Алавак», «Конь», «Калюжка», «Свой», «Пяро», «Букет» і таму падобныя, часамі самыя дзіўныя псэўданімы запаўняюць старонкі «Маяка камуны». Няўжо-ж у Быхаўскім раёне рабселькоры так паважаюць псэўданімы, а мо гэтыя заметкі пішуцца ў рэдакцыі?

Так ці інакш, але гэты факт яркі паказвае, наколькі рэдакцыя слаба праводзіць работу сярод рабселькораў, наколькі невялікім зьяўляецца давер'е мас да «Маяка камуны». Што і гаварыць, калі заметкі, не падпісаныя псэўданімамі, налічваюцца ў газэце, літаральна, адзінкамі.

І так, ліст, які шчасьліва пазбавіўся суровай рэзалюцыі: «друкавацца ня будзе», адсылаецца на «расьсьледваньне і для прыняцьця мер». Што-ж далей? Можа быць рэдакцыя пільна сочыць за ходам справы, дабіваецца хутчэйшага разгляду, канкрэтных і практычных захадаў? **Толькі ня гэта...**

За апошнія месяцы газэта **ўсяго 2 разы** зьмясьціла невялікія паведамленьні аб «прынятых мерах» па некалькіх селькораўскіх заметках. Ці ня мала? У паштовай скрынцы «Маяка камуны» можна-ж налічыць больш, чым даволі паведамленьняў аб тым, што «вашы заметкі накіраваны на расьсьледваньне і для прыняцьця мер». Якія-ж прыняты меры, як расьсьледуецца ліст рабселькора—**невядома!**

Лісты чакаюць адказу, але рэдакцыя не сьпяшаецца. Час ад часу ўспомніць, усхамянецца, дасьць пару адказаў і зноў маўчыць месяц за месяцам. І гэта замест таго, каб сыстэматычна, з пумару ў пумар, паведамляць аб выніках лістоў, даводзіць іх да ведама шырокіх мас, рашуча дабівацца хутчэйшага прыняцьця мер па кожнай рабселькораўскай заметцы.

Вывады напрашваюцца самі. «Маяк камуны» фармальна, па-казённаму адносіцца да рабселькораўскіх лістоў. Яго адказы рабселькорам—узор бюракратычнага закасьцяненьня, чыноўніцкага падыходу да сур'ёзнай палітычнай справы.

Раённаму друку трэба ўлічыць памылкі быхаўскай газэты. **Лісты рабселькораў павінны заняць адно з цэнтральных месц на старонках усяго друку.** На кожны ліст трэба даваць дакладны і вычарпальны, просты і зразумелы адказ. Трэба ўсямерна дабівацца, каб па кожнай заметцы былі прыняты неабходныя меры і паведамляць аб іх праз газэту, паказваць на канкрэтных прыкладах дзейснасьць рабселькораўскага ліста.

Глыбей жывую непасрэдную сувязь з масамі—У ГЭТЫМ АСНОЎНАЕ.

Расстрэл бастуючых рабочых у Горадні

Паліцыяй паранена 49 рабочых

Забастоўка гарадзкіх рабочых Горадні, якая выбухнула 14 ліпеня, цягнулася 6 дзён. 14-га і 15-га ў горадзе адбылося некалькі бурных дэманстрацый бастуючых. 15-га ў паўторнай дэманстрацыі прынялі актыўны ўдзел жонкі і дзеці рабочых.

У часе разгону дэманстрацыі **паранена 49 рабочых, з іх 7 цяжка.** Паліцыя, разганяючая рабочых, была спэцыяльна наёмна. У горадзе зрабілі вялізарнае ўражаньне камуністычныя лістоўкі, якія заклікалі рабочых да забастоўкі на 14 ліпеня. У Горадні больш тыдню цягнецца забастоўка рабочых фабрыкі Лайнэса.

У сувязі з 11 ліпеня, у радзе гарадоў і раёнаў Зах. Беларусі адбыліся масоўкі, на якіх прымаліся рэзалюцыі прывітаньня працоўным БССР (масоўкі ў Вільні, на Палесьсі). У дзень 11 ліпеня ў Лунінцу працоўныя масава наведалі могілкі 40 рабочых, расстраляных у 1920 г. Паліцыя вечарам разагнала сабраўшыхся і разбурыла збудаваны на магіле памятнік.

МІЖНАРОДНЫ ЧЫРВОНЫ ДЗЕНЬ ЗА МЯЖОЮ

Францыя

Антываенныя забастоўкі

ПАРЫЖ, 2. Паводле апублікаваных «Юманітэ» няпоўных вестках першажнівеньскі дзень быў адзначаны ў Парыжы і правінцыі мітынгамі, дэманстрацыямі і вывешваньнем чырвоных сьцягаў. **На многіх прадпрыемствах рабочыя спынілі работу раней вызначанага часу.**

У Парыжы многія мэталязаводы. У тым ліку аўтамабільныя заводы Рэно **1 жніўня не працавалі.** Прадпрыемцы закрылі свае прадпрыемствы на гэты дзень, спасылаючыся на крызіс, фактычна-ж **з мэтай папярэдзіць першажнівеньскае выступленьне рабочых на тэрыторыі заводу.**

У Парыжы былі сканцэнтраваны буйныя сілы паліцыі. Рад заводаў ахоўваўся патрулямі жандармэрыі і паліцыі. Пасьля буйнай дэманстрацыі 31 ліпеня кампартыя склікала ва ўсіх округах Парыжа сходы, на якіх прымала ўдзел шмат тысяч рабочых. Ухвалены рэзалюцыі супроць імпэрыялістычнай вайны і ў абарону СССР.

Зямлякопы многіх буйных будаўнічых работ у Парыжы на заклік унітарнага саюзу зямлякопаў кінулі работу на гадзіну раней.

За тры гадзіны да сканчэньня работ забаставалі 1.500 рабочых аўтамабільнага заводу Сітроэн у Сэнт-Уане. Рабочыя высунулі рад патрабаваньняў, у тым ліку: 1) не закрываюць заводу, 2) неадкладна скасаваць звышнармовую работу 3) скасаваць правілы аб штрафах і 4) заключыць калдагавор. **На працягу 3 гадзін на заводзе адбываўся мітынг. Рабочыя заводу, баючыся ўскладненьняў, не дапусьціла да работы вячэрняй зьмены рабочых.** Прадстаўнік камітэту беспрацоўных, які выступаў на сходзе бастуючых, запэўніў рабочых, што яны ў сваёй барацьбе могуць поўнасьцю разьлічваць на падтрыманьне беспрацоўных.

Аўстралія

Антываенныя дэманстрацыі ў Аўстраліі

СІДНЭЙ. 1 жніўня ў Сіднэі (Аўстраліі) адбылася антываенная дэманстрацыя. Дэманстранты ішлі да японскага консульства, протэстуючы супроць дзеяньняў Японіі на Далёкім Усходзе. Паліцыя напала на дэманстрантаў, прабуючы іх разагнаць. Дэманстранты аказалі паліцэйскім супраціўленьне. Арыштаваны 32 камуністы.

ПАЗШ

35-тысячная антываенная дэманстрацыя ў Нью-Ёрку

НЮ-ЁРК, 3. Ня гледзячы па ўзмоцненую мабілізацыю паліцэйскіх сіл, у Нью-Юніён сквэры адбылася дэманстрацыя, у якой прыняло ўдзел **35.000 рабочых.** Дэманстрацыя прайшла пад лёзунгамі барацьбы супроць голаду, на абарону Савецкага саюзу. У дэманстрацыі прымала ўдзел валікая колькасьць вэтэранаў вайны. **У Мінзаполісе** ў дзень 1 жніўня адбылася антываенная дэманстрацыя, у якой прымала ўдзел некалькі тысяч рабочых.

Японія

Звыш 305 арыштаваных у Токіё

ТОКІЁ. Ня гледзячы на масавыя арышты, праведзеныя паліцыяй напярэдадні антыімпэрыялістычнага дня, **ва ўсіх раёнах Токіё,** у тым ліку ў цэнтральных кварталах, **адбыліся 1 жніўня антываенныя дэманстрацыі.** Дэманстрацыі праходзілі пад камуністычнымі лёзунгамі. У радзе прадпрыемстваў былі арганізаваны рабочыя мітынгі. Дэманстранты распаўсюджвалі лістоўкі. У цэнтральных раёнах гораду ўпяршыню за многа год зьявіліся сьцягі з лёзунгамі, накіраванымі супроць імпэрыялістычнай вайны.

Мабілізаваная загадзя паліцыя прабавала спыніць пашырэньне лістовак і разагнаць дэманстрацыю. **Звыш 305 дэманстрантаў арыштавана.** У фабрычных раёнах удзельнікі дэманстрацыі аказвалі супраціўленьне паліцыі, у некаторых мясцох вызвалілі арыштаваных. Антываенныя дэманстрацыі адбыліся **ў Іокагаме,** дзе паліцыя арыштавала каля 200 дэманстрантаў.

Тысячы арыштаваных рабочых і сялян у Баўгарыі

ВЕНА, 3. Як паведамляюць з Софіі, тэрор баўгарскай паліцыі супроць рабочага і сялянскага руху дасягнуў напярэдадні антываеннага дня 1 жніўня нябывалых за апошнія гады разьмераў. 30 і 31 ліпеня па ўсёй Баўгарыі арыштавана шмат тысяч рабочых і сялян, у тым ліку 400 у адной толькі Софіі. Паводле паліцэйскага паведамленьня, канфіскавана да 1 жніўня больш 1 мільёну экземпляраў лістовак рабочай партыі.

Рэвалюцыйныя выступленьні у Латвіі

У ноч з 30 на 31 ліпеня на рагу Ключавой і Сталбавой вуліц адбыўся лятучы мітынг, разагнаны паліцыяй. Арыштавана 15 чалавек.

31 ліпеня на яўрэйскіх могілках адбыўся сход рабочай моладзі. На сход напала паліцыя, **якая пусьціла ў ход гумовыя дубінкі і зброю, прычым куляй паранены ў грудзі адзін з удзельнікаў сходу.**

Пры вывешваньні чырвонага сьцягу ў «парку імя 1905 году» паліцэйскі стрэл парапіў у галаву Ўладзімера Нагаша.

1 жніўня ўвечары ў прадмесьцях Рыгі адбываліся дэманстрацыі рабочых, якія разганяліся паліцыяй. Зноў у розных мясцох былі **вывешаны чырвоныя сьцягі і раскінуты камуністычныя адозвы. Арыштавана каля 50 чалавек.**

Аб рэвалюцыйных выступленьнях паведамляецца ў прэсе таксама з **Дзьвінску, Лібавы, Віндавы, Вольмара** і інш. гарадоў. У Лібаве арыштавана 4, а ў Дзьвінску 5 чал.

ШТО ДАЛЕЙ?

Урад фон-Папэна пасьля выбараў

БЭРЛІН. У цэнтры палітычнай увагі стаіць пытаньне аб тым, **якую пазыцыю ў адносінах да ўраду Папэна і ўрадавых камбінацый наогул зойме партыя цэнтру,** ад фракцыі якой цалкам залежыць стварэньне якой-бы там ні было парляманцкай большасьці. Як паведамляе **«Цвэльф ур Блят»,** у радах партыі цэнтру ёсьць па гэтым пытаньні **два пункты гледжаньня.** Адзін заключаецца ў тым, што партыя цэнтру павінна стварыць кааліцыйны ўрад у блёку з нацыянал-сацыялістамі, прычым такі ўрад павінен быць створан таксама і ў Прусіі. Аднак, большасьць партыі цэнтру прытрымліваецца, паводле вестак, іншага пункту погляду і выказваецца за стварэньне разам з нацыянал-сацыялістамі ўрадавай кааліцыі толькі ў Прусіі і за падтрыманьне ўраду Папэна або новага ўраду **правай меншасьці.** Ва ўсякім выпадку, няма сумненьня, што ў тэй ці іншай форме ўрад крайня правых будзе карыстацца падтрыманьнем партыі цэнтру.

Учора афіцыёз баварскай народнай партыі, якая зьяўляецца філіялам партыі цэнтру ў Баварыі, «Байэрышэ Фолькспартэйкарэспондэнц» у артыкуле аб выніках выбараў заявіў: «Гітлер павінен прывыкнуць да думкі, што ён стварыў моцную і вялікую партыю, але што для яго руху існуюць межы. Выбары былі-б пазбаўлены сэнсу, калі-б мацнейшая партыя цяпер адмовілася падзяліць адказнасьць за ўрад. Для нацыянал-сацыялістыцкага руху прабіла гадзіна, калі ён павінен адмовіцца ад сваёй мары аб дыктатуры партыі. Толькі такім чынам існуе пэрспэктыва заваяваць сілы ўстойлівых парляманцкіх партый для стварэньня большасьці ў новым рэйхстагу».

«Цвэльф ур Блят» паведамляе, што паводле вестак, атрыманых з бэрлінскіх нацыянал-сацыялістычных колаў, сёньня, пасьля парады цэнтральнага кіраўніцтва партыі нацыянал-сацыялістаў, з Мюнхэну ў Бэрлін прыедуць два выдатнейшых кіраўніка гэтай партыі **Герынг** і Грэгор **Штрасэр.** У першую чаргу яны маюць намер абмеркаваць **пытаньне аб далейшых урадавых** пэрспэктывах з ваенным міністрам **Шлейхэрам.** Ёсьць весткі аб тым, што нацыянал-сацыялісты не намераны падтрымліваць урад, які ўзначальваецца Папэнам, або ўвайсьці ў склад гэтага ўраду, а патрабуюць, каб на пост рэйхсканцлера быў прызначан нацыянал-сацыяліст.

Газэты дзяржаўнай партыі, партыі цэнтру і сацыял-дэмакратыі аднадушна канстатуюць, што палітыка фон-Папэна, накіраваная супроць «марксыцкага фронту», пацярпела поўнае крушэньне.

Газэты адзначаюць **значны рост камуністычных галасоў,** зазначаючы, што камуністы і сацыял-дэмакраты будуць мець у новым рэйхстагу 222 мандаты, супроць 220 у папярэднім рэйхстагу.

Сацыял-дэмакратычная «Форвэртс» асьцярожна выказвае гатоўнасьць працягваць палітыку **«меншага зла»** ў адносінах да так званага **«прэзыдыяльнага ўраду».** Паводле слоў «Форвэртс», падобны ўрад у новых умовах зьяўляецца адзінай магчымасьцю. Але такі ўрад, паводле слоў газэты, не павінен быць вузкапартыйным, якім зьяўляецца ўрад фон-Папэна. Таму орган сацыял-дэмакратыі патрабуе адстаўкі ўраду Папэна-Шлейхэра.

Орган каталіцкіх прафсаюзаў **«Дэр Дэйчэ»** зварачаецца да прэзыдэнта Гіндэнбурга і да ўраду з заклікам **не распускаць рэйхстаг.** Органы правага крыла германскай буржуазіі, на якія апіраецца фон-Папэн, прабуюць перш за ўсё **умацаваць урад Папэна-Шлейхэра** ў яго ўлёўнасьці, што ён нікольі не павінен лічыцца з **«парляманкай арытмэтыкай».** Паводле слоў гэтых газэт, урад фон-Папэна павінен далей весьці сваю ранейшую палітыку, падаючы ёй больш рэзкія формы.

Блізкая да ўраду **«Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» выступае за магчыма больш хуткую рэарганізацыю ўраду Папэна з прыцягненьнем нацыянал-сацыялістаў.** У якасьці далейшага кроку газэта прапануе неадкладна **зьмяніць** выбарчы закон у карысьць **правых.**

Аб увядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе 7-мігадовае навучальнае школы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Рабочая клясa БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, дабілася вялізарнейшых посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве, у тым ліку ў справе ажыцьцяўленьня дырэктывы партыі па ўсеагульным абавязковым навучаньні.

У 1931-32 г. з посьпехам скончана праведзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня за першапачатковую школу для дзяцей 8—11 год (ахоплена 97,9 проц.), а таксама зроблен пачатак увядзеньня ўсеагульнага навучаньня за 5 групу 7-мігадовай школы ў прамысловых цэнтрах і 17 раёнах (ахоп 96 проц.).

Гэтыя дасягненьні ў справе ўсеагульнага абавязковага навучаньня стварылі магчымасьць прыступіць ужо з гэтага 1932-33 г. да ўсеагульнага абавязковага навучаньня па ўсёй БССР за 7-мігадовую палітэхнічную школу.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Увесьці ў 1932-33 навучальным годзе ўсеагульнае абавязковае навучаньне дзяцей у аб'ёме 7-гадовай школы ва ўсіх мясцовасьцях БССР, устанавіўшы абавязковае праходжаньне поўнага курсу 7-гадовай школы для ўсіх дзяцей, якія канчаюць 1 канцэнтр (V групу), а таксама і для тых дзяцей, якія зараз навучаюцца ў старэйшым канцэнтры 7-гадовае школы.

2. Гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам на падставе арт. 1 гэтай пастановы выдаць абавязковыя пастановы аб увядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе 7-гадовай палітэхнічнай школы.

3. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы правесьці ў жніўні г. г. іменны падлік усіх дзяцей, якія падлягаюць абавязковаму навучаньню.

4. Прымаючы пад увагу вялізарнейшае палітычнае і практычнае значэньне для сацыялістычнага будаўніцтва ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня за 7-гадовую школу, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы, гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам, разам з ЦСПОБ, ЦК ЛКСМБ і інш. грамадзкімі арганізацыямі, правесьці шырокую растлумачальную работу сярод працоўных мас, дабіваючыся яшчэ большай увагі і мабілізацыі дадатковых сродкаў для праведзеньня ўсенавучу.

Прапанаваць гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам актывізаваць работу камітэтаў і камісій садзейнасьці ўсенавучу.

5. Адзначаючы, што асноўную ролю ў праведзеньні работ па ўсенавучу і асабліва па якаснай пастаноўцы работы ў масавай школе адыгрывае настаўнік, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы, раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам да пачатку новага навучальнага году праверыць выкананьне дырэктывы партыі і ўраду аб матар'яльным забесьпячэньні настаўніцтва і ліквідаваць выпадкі невыкананьня гэтых дырэктыў, прыцягваючы вінаватых да суровай адказнасьці.

Прымаючы пад увагу, што значная частка настаўнікаў ня мае спэцыяльнай пэдагагічнай асьветы, а таксама тое, што для ўсяго настаўніцтва патрэбна сыстэматычнае павышэньне кваліфікацыі, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з ЦК саюзу Працасьветы распрацаваць сыстэму перападрыхтоўкі і павышэньня кваліфікацыі настаўнікаў без адрыву ад вытворчасьці і гэтыя прапановы ўнесьці на разгляд СНК.

6. У мэтах ажыцьцяўленьня праграмы камуністычнай партыі па ўсеагульным абавязковым палітэхнічным навучаньні да 17-гадовага ўзросту, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы пачаць з 1932-33 навучальнага году разгортваньне VIII-х груп палітэхнічнае школы, адкрыўшы ў гэтым годзе ў прамысловых цэнтрах і найбольш важных раёнах да 40 груп VIII году навучаньня.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР — М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР — С. КАНДЫБОВІЧ.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Чатыры сталінскіх мартэны гатовы да пуску

У сувязі з надыходзячым пускам мартэнаўскага цэху, начальнік Кузьнецкбуду тав. Франкфурт у гутарцы з карэспандэнтам РОСТА заявіў:

— Гаворачы аб пуску буйнейшага ў Саюзе і ў Эўропе мартэнаўскага цэху з навейшым абсталяваньнем, неабходна мець на ўвазе спэцыфічныя абставіны і характэрную абстаноўку нашай пляцоўкі. Мы пускаем не адну печ, а чатыры і вядзем разгорнутыя работы па астатніх печах.

Мы поўнасьцю закончваем усе прылягаючыя да цэху агрэгаты. Стрынгер (праводжны каркас будынку) закончан поўнасьцю для ўсяго цэху. Будынак закончан поўнасьцю і выкладзен цэглай. Скрапны дворгатоў. Скончана футэроўка газагенэратараў і газаправодаў на ўвесь цэх. Закончаны водаправод і каналізацыі амаль на ўвесь цэх.

У галіне абслугоўваючых цэх агрэгата ў мы пабудавалі значна больш таго, што патрэбна для пуску першых печаў.

Печы ў тым становішчы, у якім яны знаходзяцца сёньня, можна пускаць. Але мы параілі пускаць цэх без масовак на пастаянным водзе і пастаяннай каналізацыі. Больш таго, мы робім рад дадатковых пабудоў (даламітавая фабрыка, глінамільны завод, экспрэс-лябараторыя і інш.) для таго, каб забясьпечыць бесьперабойную работу печаў. Мы хочам, каб пуск нашага мартэнаўскага цэху быў прыкладам таго, як трэба пускаць цэхі.

Выяўлены пакла́ды храміту і нікелю на Ўрале

СЬЕЯРДЛОЎСК. У Бісэры, недалёка ад Чусавой, па Цысоўскім рудніку, выяўлены храміты і нікелевая руда. Зараз вядзецца далейшая разьведка па гэтыя руды.

Будматар'ялы

Камбінат **«Камінтэрн»** за 31 ліпеня расьпілаваў 159,7 куб. мэтраў драўніны, што складае 73,3 проц. дзеннага заданьня.

***

На заводзе **«Чырвоны Кастрычнік»** за 3-ю дэкаду ліпеня выпрацавана 76,9 тоны будаўнічых цьвікоў — 54,4 проц. месячнага пляну. 31 ліпеня выпушчана 4,5 тоны — 66,1 проц. дзеннага заданьня і 1-га жніўня — 7,3 тоны — 142,3 проц.

Папера

Добруская папяровая фабрыка **«Герой працы»** 31 ліпеня выпрацавала 40,4 тоны паперы, што дае 41,9 проц. дзеннай праграмы.

***

На фабрыцы **«Спартак»** за 29 і 30 ліпеня выпушчана 31,3 тоны паперы або 73,1 проц. дзеннага пляну і 31—16,6 тоны—82 проц.

Скура

Чырвонасьцяжная гарбарня **«Бальшавік»** прамфінплян ліпеня выканала на 102,9 проц., выпусьціла прадукцыі на 525.247 руб.

Скандынавія

Хваля масавых дэманстрацый

СТАКГОЛЬМ. 1 жніўня па ўсёй Скандынавіі пракацілася хваля масавых дэманстрацый, сходаў і мітынгаў. У Швэцыі дэманстрацыі і мітынгі ішлі па ўсёй краіне. У цэнтральным мітынгу ў Стакгольме прыняла ўдзел 6 тыс. рабочых. У Нарвэгіі пад кіраўніцтвам кампартыі адбыліся дэманстрацыі ў Осло, Бергене, Тродгейме і ў радзе інш. месц. Найбольшы размах прыняла дэманстрацыі ў Даніі. У Копэнгагене на цэнтральным мітынгу прысутнічала звыш 20 тыс. рабочых.

Новы польска-германскі інцыдэнт

БЭРЛІН, 3. Правыя германскія газэты на відным месцы падаюць паведамленьне аб новым германа-польскім інцыдэнце ў сувязі з так званым «сьвятам мора». Па загаду паліцыі быў прымацаваны польскі нацыянальны сьцяг да плоту, які аддзяляе ад вуліцы садзік перад домам германскага дарадцы ў Варшаве. Па загаду германскага дарадцы сьцяг быў зьняты. У садзік уварваліся тры польскія паліцэйскія і патрабавалі ад дарадцы прад'явіць пасьведчаньне асобы. Дарадца выканаў гэта, пасьля чаго сьцяг быў прымацаваны па-за экстэрытарыяльным будынкам.

Польскія газэты разгарнулі шалёную кампанію супроць германскага дарадцы. Апошні зьвярнуўся да польскага ўраду з энэргічным пратэстам. Правая германская прэса усяк раздувае гэты выпадак, заяўляючы, што пры такіх умовах выключана магчымасьць нармальнай работы германскага прадстаўніцтва ў польскай сталіцы.

„Маральнае раззбраеньне" польскага фашызму

ВАРШАВА, 3. У Гдыні адбылося «сьвята мора», якое ўжо даўно падрыхтоўвалася, **на чале з прэзыдэнтам Масьціцкім і прэм'ерам Прыстарам.** Ва ўрачыстасьцях прымалі ўдзел дэлегацыі ад розпастайных польскіх фашысцкіх арганізацый. Адбыўся парад ваенных суднаў і войск. Польскі друк карыстаецца гэтым сьвятам для новай антыгерманскай агітацыі. Газэты асабліва нездаволены з супаўшым з гэтымі ўрачыстасьцямі палётам германскага цэпэліну, які прыбыў у Данцыг, дзе быў урачыста спатканы. Алтуль ён выляцеў у Скандынаўскія краіны. Польскія газэты разглядаюць гэты палёт, як контр-дэманстрацыю з боку Германіі супроць польскай дэманстрацыі ў Гдыні. Газэты асабліва падкрэсьліваюць, што германскі дырыжабль два разы дэманстрацыйна лятаў над Гдыняю.

Кітай

Не дапамагла і паліцыя

ШАНХАЙ, 3. У дзень 1 жніўня сілы паліцыі ў Шанхаі былі мабілізаваны. У некалькіх пунктах міжнароднага сэтльмэнту і кітайскай часткі гораду групы рабочых і студэнтаў распаўсюджвалі лістоўкі, выкрыквалі рэвалюцыйныя лёзунгі. Два разы ў міжнародным сэтльмэнце мелі месца спробы арганізаваць дэманстрацыі. Дэманстранты былі разагнаны паліцыяй. Паліцыя захапіла вялікую колькасьць першажнівеньскай літаратуры і арыштавала на вуліцах 9 чалавек.

Сёньня ў Менску аб'яднанае пасяджэньне конкурсных камісій Украіны, Каўказу і БССР

Сёньня, у 10 гадз. раніцы, у памяшканьні Дому Пісьменьніка (Савецкая вул., д. № 68) пачнецца аб'яднанае пасяджэньне камісій Украіны, Паўночнага Каўказу і БССР па правядзеньні ўсесаюзнага конкурсу «Праўды» на лепшую работу нізавых газэт па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

На пасяджэньні будуць падведзены вынікі спаборніцтва паміж БССР, УССР і Паўночным Каўказам.

Для ўдзелу ў пасяджэньні запрашаюцца партыйны актыў, рабкоры, работнікі цэнтральных і фабрычных газэт, інжынэрна-тэхнічныя работнікі і настаўніцтва.

Цэнтральная конкурсная камісія пры «Зьвязьдзе».

Усім сакратаром парткалектываў і ячэйкам КП(б)Б

На аснове пастановы Бюро ад 31-VII-32 г. прапануецца вам 7-га жніўня правесьці агульныя партыйна-камсамольскія сходы з прыцягненьнем шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і служачых, прысьвечаных 15-цігодзьдзю «Зьвязды»

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

СЬПІС

вылучаных дакладчыкаў Менгаркомам КП(б)Б па праведзеньні партдзён у сувязі з юбілеем „Зьвязды" і пяцігодзьдзя пераходу яе на беларускую мову

3-д імя Варашылава — МІТЛІН (рэд. «Зьвязда»), **«Бальшавік» — КАЖДАН** (ГК КП(б)Б), **Гута—КАРЖАНЕВІЧ** (ГК КП(б)Б), **«Акцябр»—ФРАДЗІН** (ГК КП(б)Б), **Д. А.—ШНЫТКО** (Гарпракуратура), **«Камунар»—ПЛАТУН,** Электрастанцыя **— КАРАНЕЎСКІ** (Гарсавет), **«Ударнік» — РУДЗНБЕРГ** (ГК ЛКСМБ), **Хлебазавод — ЗЕНКЕВІЧ** (Гарсавет), **Абутковая—ЗАЛАТУХІН** (ЦК КП(б)Б), **Скарняжная — МОДЗЛЬ** (ЦК КП(б)Б), **Шчотачная — КУРЦІК** (ЦК КП(б)Б), **«Камунарка» — ШАСТАКОЎ, друкарня імя Сталіна — ВІТЛІН** (ЦК КП(б)Б), **«8-га сакавіка» — ЖЫХАРАЎ** (ГК КП(б)Б), **Уціль—ЛАХМАН** (ГК КП(б)Б), **Мясакамбінат — АДАМСОН** («Савецкая Беларусь»), **«Беларусь» — КАПУЦЬКІН** («Савецкая Беларусь»), **Цягі — САЕВІЧ** (інст. Гістар. рэв. руху), **Руху — АЎЧЫНЬНІКАЎ** (Камвуз), **Шляку — АГУЛЬНІКАЎ** (Камвуз), **«Беларуска» — КАЗАЧОК** (ЦК КП(б)Б), **Белдзяржбуд—ХАДАСЕВІЧ** (ГКК КП(б)Б), **Мендуп — КУЛІНЕНКА** (ГКК КП(б)Б), **Вадаправод — РУБЕНЧЫК** (Белта), **Абутковая майстэрня—ВЕРЖБАЛОВІЧ** («Рабселькор»), **«Усход» — ДЗЕРАХ** («Рабселькор»), **«Чырвоны Тэкстыльшчык» — КАБАКОЎ** (ОРКА), **Шпалерная—ХАЛЕНА** (ЦК КП(б)Б), **«Чырвоная зорка» — МЯДЗЬВЕДЗЯЎ** («Савецкая Беларусь»), **Харчавікоў — БЯЛУГА** (НКА), **Белсампрамсаюз — ДУНЕЦ** («Акцябр»), **«Пралетары» — ЧОРНАБРОДАЎ** (НКА), **«Чырвоны хімік» — КАВАЛЁЎ** (ЦСПСБ), **Сьпіртзавод — РАМАНЧУК** (інст. рэв. руху), **Хэмфармзавод—ПАПОЎ** («Зьвязда»), **«Полымя рэвалюцыі»—ГРЫЦКЕВІЧ** (ГК КП(б)Б).

Рэзэрв: ІОФЭ — («Зьвязда»), **ЧАРНЯКОЎ** («Рабселькор»), **САМУЦІН** («Зьвязда»), **ТАКАРЧУК** («Зьвязда»).

Сенецкі с.-с. — МАРОЗАЎ («Рабочий»), **Ратамскі с.-с. — МАЛЕКІН** (Радыё), **Падгайскі с.-с. — ПУЗІКАЎ** («Рабселькор»), **Каладзішчанскі — БЕРАЗОЎСКАЯ** («Зьвязда»), **Новадворскі с.-с. — ЖАРСКІ** («Орка»), **А-Гарадзецкі с.-с. — ПРЫНЦ** («Орка»), **Папярнянскі с.-с. — КЛІМКОВІЧ** (ЦСПСБ), **Строчыцкі с.-с. — БРАЎДА** («Рабочий»), **Каралішчанскі с.-с. — ВАЙЦЯХОВІЧ** (Белта), **Гатаўскі с.-с. — СТАЛЭЛІС—** (Літоўская).

Дадаткова вылучаны:

ПЯТРОВІЧ, ПЯТРУШЭНЯ, БОЙДАР, ЖУК, БАБРОВІЧ, БУТКЕВІЧ, ВЯТКОЎСКІ, БАГДАНАЎ, ВАШКЕВІЧ, АНДРЭЯЎ, БАНДАРЭНКО (Дзяржплян), **ЛЕВІНА** (Д. Камасьветы), **БАЛОТНІКАЎ** (Гіст. Парт.), **ГЭРЧЫКАЎ** (ГК КП(б)Б), **ЭПШТЭЙН, СКУМАН** (Бінзо), **ПУГАЧОЎ, РЫМША, ГУРЭВІЧ Ц., КУШНЕР, ТРУС, УЛАЗАЎ** (Гіспарт), **ЗЭЛЬЦАР, КЛІМАЎ, АСАЎЛЯК** (ЦК КП(б)Б), **ГЭРЦОВІЧ, АЛЬГІНСКАЯ** (Камвуз), **РОХКІН, АНДРЭЙЧЫКАВА, ПЭУЗНЭР, ВЫЛЬЧЫК, РУБЕНЧЫК** (ЦК КП(б)Б).

Вышэй пералічаныя таварышы павінны зьявіцца на інструкцыйную нараду, якая адбудзецца 5-VIII а 7-й гадз. увечары ў рэдакцыі «Зьвязды». (Савецкая, 63 пакой рэдактара).

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Паведамленьні

— Сёньня, 5-VIII-32 г., у 6 гадз. веч., у культпропе ГК (2-гі паверх, пакой № 24) адбудзецца нарада культпропаў і прапагандыстаў п/к і ячэек па пытаньні аб ходзе летняй партвучобы і выніках прапрацоўкі пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК. Катэгарычна прапануецца зьявіцца на нараду наступным т. т.: Аўдзейчык, Норкін, Камісарчык, Готліб, Прыханскі, Брэгман, Добрадзей, Каткоў, Жураўскі, Луцэвіч, Брудно, Лакман, Ленін, Жыхараў, Файн, Шыманскі і Шавель. Яўка без спазьненьня.

— Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 6 жніўня ў Копылі і 10 жніўня ў Старых-Дарогах будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разглядзе наступных апэляцыйных спраў: на 6 жніўня ў Копылі: Квасьніцкі Н. С., Давідчык А., Шкуцько А., Дзямідовіч А., Рытчык В. М., Самоцік В. Д., Лебедзевіч У. М., Місючэнка Я. М., Макаўчук І., Мікалаеня М., Завін І. С. На 10 жніўня ў Ст.-Дарогах: Буй Р. П., Хэйман М. Ш., Розум М. С., Авакумаў І. М., Юркевіч А. Яўка выпэйпамянёных таварышоў на ПТ абавязкова з прадстаўленьнем характарыстыкі аб апошняй рабоце.

— Згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 22/VII г. г., склікаюцца **куставыя партнарады** па пытаньні **падрыхтоўкі да новага навучальнага году** ў наступным парадку:

У гор. Менску — 10 жніўня, з удзелам Асіпавіцкага, Бабруйскага, Барысаўскага, Бягомльскага, Вярэйскага, Глускага, Заслаўскага, Койданаўскага, Капыльскага, Крупскага, Лагойскага, Любаньскага, Плешчаніцкага, Парыцкага, Пухавіцкага, Слуцкага, Смалявіцкага, Стара-Дароскага, Старобінскага, Талачынскага, Вузьдзенскага, Чырвона-Слабодзкага, Чэрвеньскага і Менскага раёнаў.

У гор. Віцебску — 10 жніўня, з удзелам Аршанскага, Асьвейскага, Бешанковіцкага, Вушацкага, Гарадоцкага, Дрысенскага, Лёзьненскага, Лепельскага, Полацкага, Расонскага, Сенненскага, Сіроцінскага, Сураскага, Чашніцкага і Віцебскага раёнаў.

У гор. Гомелі — 15 жніўня, з удзелам Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага, Ельскага, Жлобінскага, Жыткавіцкага, Камарынскага, Карміянскага, Лельчыцкага, Лоеўскага, Мазырскага, Нараўлянскага, Пятрыкоўскага, Прапойскага, Рэчыцкага, Тураўскага, Уваравіцкага, Хойніцкага, Чэрахаўскага, Чачэрскага і Гомельскага раёнаў.

У гор. Магілеве — 15 жніўня, з удзелам Быхаўскага, Бялынічскага, Горацкага, Дубровенскага, Касьцюковіцкага, Клімавіцкага, Клічаўскага, Чырвонапольскага, Крычаўскага, Мсьціслаўскага, Рагачоўскага, Чавускага, Чэрыкаўскага, Шклоўскага і Магілеўскага раёнаў.

Парадак дня нарады — даклады загадчыкаў культпропаў КП(б)Б і НКАсьветы аб ходзе работ па падрыхтоўцы да новага навучальнага году.

На партнарады павінны абавязкова прыбыць усе загадчыкі культпропаў ГК і РК КП(б)Б, ГК і РК ЛКСМБ, заг. гар. і райаддзелаў Нарасьветы і старшыні гар. і райкомаў саюзу працасьветы.

Партнарады пачынаюць сваю працу ў 11 гадзін раніны. Рэгістрацыя дэлегатаў праводзіцца ў Віцебскім, Гомельскім гаркоме і Магілеўскім райкоме КП(б)Б, а ў Менску — у НКАсьветы.

Нам. заг. Культпропу ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

5-VIII у 7 гадзін веч. у памяшканьні рэдакцыі газэты „Зьвязда" адбудзецца
АДКРЫТЫ АГУЛЬНЫ СХОД
парткалектыву цэнтральных газэт
з парадкам дня:
Дэклад аб юбілею газэты „Зьвязда".
Яўка ўсіх партыйцаў абавязкова. Запрашаюцца і беспартыйныя.

11-га жніўня, у 6 гадзін вечара, у садзе „ПРАФІНТЭРН" склікаецца
ЗЬЛЁТ ПРЫЗЫЎНІКАЎ
1910-га году нараджэньня
гор. МЕНСКУ.
Яўка ўсіх прызыўнікаў абавязкова.
Менскі райваенкамат.

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН"
Сёньня і штодзённа
5-ы цыкль 5-ы цыкль
„МЮЗІК-ХОЛ"
Пачатак у 9 гадз. вечара.

„Чырвоная Зорка" — Сёньня і штодзённа Пуцёўка ў жыцьцё
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Усходні мастацкі фільм ЧАДРА. Звыш прагр. кроніка Саюзкіно.
кіно „Пралетары" — Мастацкі фільм ЗА МАНАСТЫРКАЙ СЦЯНОЙ у 7 частках. Дзённыя дзіцячыя сэансы мастацкі фільм ІХНЯЯ ВУЛІЦА.

Пастановай СПА ад 22-III—г. г. за № 265 прапануецца закончыць распрацоўку тэхнічных праектаў для будаўніцтва 23 году да канца 32 году. Пастанова СНК СССР ад 3-VII—г. г. № 1083 абавязвае Дзяржплян Саюзу ССР ня ўключаць у тытульныя сьпісы капітальнага будаўніцтва па аддрах аб'ёкты, не забясьпечаныя праектамі.
„ВУЗСТРОЙПРОЕКТ"
(б. „Гипровтуз"),
якому даручана праектаваньне навучальных будынкаў і інтэрнатаў да іх (пастанова Дзяржпляну ад 22-II—г. г. № 44)
папярэджвае, што заяўкі на праектаваньне прымаюцца да 1-га верасьня. Заказы і дагаворы афармляюцца да 1-га кастрычніка.
Апытальныя лісты для перадачы заказу на праектаваньне высылаюцца па першым запатрабаваньні.
„Москва. Столешников пер., д. № 7. Вузстройпроект".

кіно „СПАРТАК" — З 5-га жніўня мастацкі фільм
1-ая сэрыя МІС-МЭНД у 7 частках.
У галоўных ролях: Ігар Ільінскі, Фогель, Камароў.
ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ.
ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ—6 гадз. 30 м., 2-га — —8 гадз. —, 3-га — —9 гадз. 30 м., 4-га — —11 гадз. —
КАСА—з 5 гадз.

ПАТРЭБНЫ КАРЭКТАРЫ
якія добраведаюць бел. мову.
Зварачацца: Савецкая, 63, 2-гі паверх выдавецтва „ЗЬВЯЗДА".

МЕНСКІ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ТЭ